Пралетары усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

№ 262 (3370) Нядзеля 17 лістапада 1929 г.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

РАДЫЁ у гадз. ночы:

ШАНХАЙ, 16. Харбінскі карэспандэнт амэрыканскай газэты „Сэндэй Рэвью" тэлеграфуе, што мукдэнцы ўзмоцнена рыхтуюцца да нападу на тэрыторыю СССР, па ўсей відавочнасьці, у напрамку на Упадываcток. У Харбіне працягваецца канцэнтрацыя войска, а таксама прыбывае шмат амуніцыі і цяжкай артыперыі.

ЯПОНСКІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

Паказальная электрафікацыя саўгасу „Высокае"

ВОРША. (Наш кар.) Для паказальнай электрафікацыі саўгасаў па Аршанскай акрузе ў раёне дзейнасьці Асінбуду вызначаны саўгас „Высокае". Гэты саўгас мае бровар і цагэльню. Прэзыдыум акрвыканкому даручыў Асінбуду дагаварыцца з Белсельтрэстам наконт практычнага ажыцьцяўленьня гэтага мерапрыемства.

ЧАРГОВЫ МАНЭЎР ПОЛЬСКАЙ ДЫПЛЁМАТЫІ

Галуўко выступае ад імя ня толькі Польшчы, але і ўсіх бальтыцкіх дзяржаў

Выступленьне Галуўко прыкрывае агрэсыўныя пляны польскага імпэрыялізму супроць СССР

ВАРШАВА, 15. Сёньня ў польскіх газэтах надрукавана вялізнае інтэрв'ю начальніка Усходняга аддзелу Польскага міністэрства замежных спраў Галуўко. Зварачае ўвагу ўжо загаловак, пад якім надрукавана гэтае інтэрв'ю, а менна: «Мірная палітыка Польшчы і бальтыцкіх дзяржаў у адносінах да Савецкай Расіі». Інтэрв'ю пабудавана так, што **Галуўко гаворыць ня толькі ад імя Польшчы, але і ад імя ўсіх бальтыцкіх дзяржаў.**

Адзначаючы «непакой» савецкага друку з поваду яго паездкі ў бальтыцкія дзяржавы, Галуўко заяўляе:

«Палітыка польскага міністра замежных спраў Залескага зьяўляецца мірнай. Таму дзіўна, што афіцыйны савецкі друк бачыць ў паездцы Залескага ў Бухарэст і ў паездцы маёй скромнай асобы ў бальтыцкія дзяржавы нейкі антысавецкі характар. На мой погляд Залескі даў толькі довад шчырай і мірнай палітыкі, паміж іншым і ў адносінах да СССР, што гэтыя сьцьвярджэньні савецкага друку трэба прызнаць яўна няверными і беспадстаўнымі. Больш чым беспадстаўнае падазрэньне, быццам я, па ўласнай ініцыятыве і дзейнічаючы нелёйльна ў адносінах да майго кіраўніка, могчы весьці палітыку антысавецкага блёку ў Прыбальтыцы. Я павінен прыпамянуць, што я заўсёды лічыў вар'яцтвам арганізацыю мерапрыемстваў, і ўдзел усіх Польшчы, якія маюць на мэце звяжэньне сучаснага ўраду ў Маскве і садзейнічаньне паваротту да ўлады нацыяналісцкіх элемэнтаў. Я павінен заявіць, што, як я канстатаваў у сваіх размовах з бальтыцкімі палітычнымі дзеячамі, яны прытрымліваюцца таго-ж пункту погляду. У гэтым няма нічога дзіўнага.

Бальтыцкія дзяржавы таксама, як і мы, заключылі мірныя дагаворы з СССР, якія яны павінны захоўваць і ўстанавілі нармальныя эканамічныя адносіны з СССР. Так, напрыклад, гандлёвы дагавор паміж Латвіяй і СССР зьявіўся выгадным для Латвіі. Між іншым ні адна з груповак рускай эміграцыі ня хоча пагадзіцца з незалежнасьцю бальтыцкіх дзяржаў. У імя чаго гэтыя дзяржавы маглі-б імкнуцца да зьмены становішча ў Маскве? Бальтыцкія дзяржавы хочуць міру і дзяржаўнай незалежнасьці. Гэта зьяўляецца таксама праграмай Польшчы на ўсходзе Эўропы».

На пытаньне аднаго з журналістых, чым-жа тлумачыцца «падазронасьць СССР у адносінах да Польшчы», Галуўко заявіў наступнае:

«У гэтым няма нічога дзіўнага. СССР — небясьпечны вораг для ўсяго капіталістычнага сьвету. Творцы камуністычнага ладу думаюць, што яны заўсёды могуць быць падданы нападам з боку капіталістычнага сьвету. Адгэтуль вынлывае недавер'е да ўсёй Эўропы, не выключаючы таксама і тых дзяржаў, з якімі СССР знаходзіцца ў прыязных палітычных адносінах». Канстатуючы, што само існаваньне СССР зьяўляецца нявыгадным у Эўропе, Галуўко адразу пераходзіць да падзей 1920 году і заяўляе:

— «Польшча давяла ўжо ў 1920 годзе, якой сілаю яна зьяўляецца. За гэты час Польшча пайшла ўпярод ва ўсіх галінах гаспадарчага жыцьця і ўзьняла сваё міжнароднае значэньне. Савецкая грамадзкая думка разумее, што ніякае анты-савецкае выступленьне не магчыма без удзелу Польшчы. Мы гэта таксама разумеем. Аднак, паміж усьведамленьнем гэтых магчымасьцяй і сьвядомай волею да іх ажыцьцяўленьня — ляжыць бяздоньне. На вялікі жаль неабходна канстатаваць, што савецкая грамадзкая думка не ацэньвае ў патрэбнай меры нашай сьвядомай мірнай палітыкі ў адносінах да СССР».

Ня менш характэрным зьяўляецца заключны абзац інтэрв'ю Галуўко, які адносіцца да СССР: «Праўда, — заяўляе Галуўко, — у інтарэсах справядлівасьці неабходна канстатаваць, што некаторую падставу для непакою Савецкаму Саюзу даюць паводзіны тае часьці польскага друку, якая ў сваіх анты-камуністычных выступленьнях перагінае палку, нападаючы неадпаведным чынам на пасольства дзяржавы, з якой у нас існуюць нармальныя мірныя адносіны». Галуўко, аднак, знаходзіць апраўданьне для гэтай часьці друку ў так званай свабодзе друку, са «злоўжываньнямі» якога польскаму ўраду прыходзіцца цяжка змагацца. (ТАСС).

***

Інтэрв'ю начальніка Ўсходняга аддзелу Польскага міністэрства замежных спраў Галуўко зьяўляецца бязумоўна **чарговым манэўрам польскай дыплёматыі, які мае на мэце прыкрыць шалёны тэмп узбраеньняў і падрыхтоўкі польскага фашызму да нападу на СССР.**

І сапраўды, каго могуць пераканаць словы фашысцкага дыплёмата, калі факты штодзённага жыцьця сьведчаць аб адваротным. Так, калі край задыхаецца ў клешчах эканамічнага крызісу, калі тысячы рабочых амаль кожны дзень выкідваюцца на вуліцу—ваенная прамысловасьць працуе бесьперабойна днём і ночу на тры зьмены. Дзяржаваю заняты ўсе тыя прыватныя фабрыкі і заводы, якія могуць быць здатнымі для ўзмацненьня баявой падрыхтоўкі Польшчы. Буйныя хэмічныя фабрыкі знаходзяцца ў руках дзяржавы, акрамя таго будуюцца новыя. Будуецца порт і ў Гдыні, які мае вялікае ваеннае значэньне, на французскіх вэрфах будуецца ваенны флёт для Польшчы, будуюцца новыя стратэгічныя чыгункі і шосы, пераважна на савецкім пагранічча.

На ўсе дзяржаўныя прадпрыемствы і ўстановы камандураваны афіцэры, мілітарызаваны паліцыя, чыгункі і г. д. Звыш 50 проц. усяго бюджэту працыцца па простым прызначэньні на вайсковыя выдаткі, а калі дадаць да гэтага выдаткі на гэту-ж мэту, якія робяцца пад розным выглядам іншымі міністэрствамі, дык выдаткі на падрыхтоўку вайны дасягнуць звыш 70 проц.

Нарэшце, **амаль бязупынная анты-савецкая кампанія, якая праводзіцца фашысцкай польскай прэсай па загаду Ўраду супроць СССР і якая мае на мэце трымаць у напружаным становішчы польскага абываталя з прычыны нібы небясьпекі з Усходу, а ў сапраўднасьці з мэтаю прыкрыцьця ўласных шалёных узбраеньняў—усё гэта аж надта выразна сьведчыць аб «мірнай» палітыцы Польшчы.**

Акрамя ўсяго гэтага мы маем і новыя довады гэтай «мірнай» палітыкі фашысцкай Польшчы ў адносінах да СССР. Так, «Кур. Віленскі» у № 250 падае, што **зараз праводзіцца ў Віленшчыне вайсковы перагляд усіх радавых запасу і апалчэньня, якія нарадзіліся ў 1902 годзе.** Ня сумняваемся, што пасьля перагляду гэтага году, будзе праведзены перагляд і іншых гадоў нараджэньня. «Кур. Віл.» у гэтым-жа нумары падае, што **кіраўніцтва адрасными сталамі перадаецца ў рукі «спэцыялістых», былых вайсковых,** якія добра ведаюць службу «асабовую», што надасьць у выніку большую гібкасьць і рухавасьць вайсковым аддзелам. Асаблівую ўвагу гэтыя «спэцыялістыя» павінны зварачаць на мужчын.

Далей гэта-ж газэта падае, што «На моцы вайсковых загадаў, **кожны чалавек, які выяжджае на пэўны час з месца сталага пражываньня, абавязаны паведамляць аб гэтым адпаведную ўладу, ўпаўнаважаную весьці явачны стол вайсковых». Асобы-ж, якія паводле сваёй службы прымушаны часта выяжджаць, «могуць атрымаць дазвол ад адміністрацыйнае ўлады на вызваленьне ад кожнаразовае яўкі, пры чым яны абавязаны назваць асобу, якая заўсёды будзе ведаць пра месцазнаходжаньне атрымаўшага дазвол і будзе НЕСЬЦІ АДКАЗНАСЬЦЬ за выкананьне апошнім вайсковых абавязкаў. Заяўляцца павінны ўсе радавыя рэзэрву і апалчэньня нараджэньня ад 1883 да 1911 г.»**

Аб чым сьведчаць усе гэтыя распараджэньні фашысцкага ўраду? Гэтае, здавалася-б, нязначнае паведамленьне ясна гаворыць, куды накіравана ўвага ўраду—**«трыманьне рукі на пульсе»** (забесьпячэньне шпаркасьці мабілізацыі вайсковых сіл), **вучот «благанадзейнасьці» вайскова-абавязаных і абмежаваньне рэвалюцыйнага руху.** Трэба прызнаць, што гэтае мерапрыемства фашысцкага ўраду накіравана, галоўным чынам, супроць рэвалюцыйнага руху, які зьяўляецца найбольш небясьпечным як для самога фашызму, так і для яго плянаў—узброенага паходу на СССР.

Інтэрв'ю Галуўко характэрна яшчэ і тым, што ў імён выступае ад імя ўсіх прыбальтыцкіх дзяржаў. Цікава ведаць, паводле чыйго дазволу ён выступіў ад імя гэтых дзяржаваў? Калі пацьвердзіцца факт, што выступленьне Галуўко адбылося за згоды замянёных дзяржаў, дык **мы стаімо перад фактам стварэньня блёку прыбальтыцкіх дзяржаў пад кіраўніцтвам Польшчы,** аб чым многа пісалася ў савецкім друку. Блёк-жа гэты накіраваны супроць СССР.

Ці разрубае Пілсудзкі гордыеў вузел?

ВАРШАВА, 14. Пасьля сьвяткаваньняў, зьвязаных з юбілеем аднаўленьня Польшчы, пытаньне аб надыходзячай бюджэтнай сэсіі сойму зноў стаіць у парадку дня. З моманту адкрыцьця сэсіі адтэрмінаваны на 30 дзён канфлікт зноў становіцца актуальным, і ўрад павінен прыняць тыя, або іншыя крокі, каб разрубіць Гордыеў вузел, які стварыўся пасьля рэпэтыцыі дзяржаўнага перавароту.

Адносна тактыкі ўраду ў палітычных колах існуюць самыя розныя меркаваньні. Аднак, пры ўсёй розьніцы ацэнак усе зыходзяцца на адным пункце, а іменна,—што становішча стварылася нязвычайна складанае і ў высокай ступені напружанае. Што датычыць ураду, дык ён наўрад ці прыняў якую-небудзь пастанову. У даны момант адбываецца пакуль барацьба розных уплываў. У палітычных колах, у прыватнасьці, кансэрватыўных высоўваюцца тры магчымыя выхады. **Першы,** найбольш радыкальны, якога дамагаюцца палкоўніцкая група і кансэрватары, гэта—роспуск сойму і ўвядзеньне новай канстытуцыі дэкрэтам прэзыдэнта, г. зн. **шлях дзяржаўнага перавароту.** Гэты шлях пры данай агульна-гаспадарчай і палітычнай абстаноўцы лічыцца, праўда, вельмі рызыкоўным, але за тое адзіна правільным для ўзмацненьня фашысцкай дыктатуры. **Другі праект, гэта—роспуск сойму і правядзеньне выбараў** пры спэцыфічным адміністрацыйным націску. Нешматлікія прыхільнікі гэтага пляну лічаць, што, напершае, апазыцыйныя партыі ня маюць сродкаў для барацьбы і, падругое, што, як паказвае румынская практыка, удзел адміністрацыі можа даць жадаемую ўрадавую большасьць. У выпадку няўдачы вярхоўны суд мог бы скасаваць выбары, і, тады, у часе «міжцарства» магла-б быць дэкрэтавана новая канстытуцыя.

Нарэшце, **трэці праект,**—гэта зварот да «сыстэмы былога прэм'ера Бартэля», г. зн **адстаўка ўраду Сьвітальскага і назначэньне новага прэм'ера,** які мог-бы лічыцца прыхільнікам «супрацоўніцтва» з соймам. Зварот да бартэлеўскай сыстэмы, адстаўка майёра Прыстора і ўступкі пэпэсаўскім патрабаваньням у пытаньні аб больнічных касах і самакіраўніцтвах далі-б магчымасьць апазыцыі выйсьці са створанага тупіку і прыступіць да «дзелавое працы».

Усе гэтыя праекты і супярэчлівыя чуткі сьвараюць вострую палітычную атмасфэру. Апазыцыйныя колы настроены надзвычай трывожна і баяцца, што ўрад стане на шлях дзяржаўнага перавароту. З другога боку, распаўсюджваюцца ўпартыя чуткі, што адстаўка Сьвітальскага ўжо вырашана і кандыдатамі на пост прэм'ера зьяўляюцца пасланьнік у Маскве Патэк, генэрал Сасноўскі і інш.

Сёньня ў апазыцыйнай прэсе апублікавана славутае інтэрв'ю старшыні сойму Дашынскага, якое зьяўляецца з аднаго боку, паказальнікам трывожных настроў апазыцыі, а з другога, апэляцыя «да розуму і сумленьня» Пілсудзкага, каб ён падумаў яшчэ раз перш, чым загнаць левую апазыцыю, якая імкнецца, па сутнасьці да супрацоўніцтва з урадам, у «абэнтынскі тупік».

Дашынскі зазначае, что ўрад прад'яўляе патрабаваньні, якія перавышаюць магчымасьці сойму. Сойм ня можа публічна адмовіцца ад сваіх праў кантраляваць выдаткаваньне дзяржаўных сродкаў. Сам урад і дзяржаўны кантроль прыйшлі ў сойм з вялізнымі бюджэтнымі перавыдаткамі на суму ў 680 млн. злотых. Нарэшце, урад унёс бюджэт па 1930-31 г. «Сумленным выхадам» з сучаснага становішча Дашынскі лічыць дзьве магчымасьці: або прэзыдэнт павінен распусьціць сойм, або назначыць новы ўрад «Сумленных людзі»,—заяўляе Дашынскі,—раяць распусьціць сойм, але не назначаць выбараў. Другія раяць не распускаць сойму і назначыць урад, які нічым не адрозьніваецца ад цяперашняга. Такія парады даюцца людзьмі, каторыя лічаць, што палітыка нішто іншае, як матэмэтыцтва».

Інтэрв'ю Дашынскага, напісанае ім па ўласнай ініцыятыве, бязумоўна, зьяўляецца дакумантам для «пракурора гісторыі». Дашынскі загадзя страхуе сябе заявамі, што ён зрабіў усё, што ад яго залежыць, для ўзмацненьня міру і парадку ў краіне.

У такім-жа духу вытрымана заява цэнтральнага органу ППС «Работніка». «Работнік» публікуе рапарт вярхоўнага дзяржаўнага кантролю, з якога відаць, што былы міністар пошт і тэлеграфаў Мядзінскі выдаткаваў вялізныя сумы з дзяржаўных сродкаў на свае асабістыя патрэбы, у якія ўваходзяць балі, тэатры, рэстараны, выдача дапамогі невядомым асобам па невядомых прычынах і нават... прадстаўніцкія папяросы. Наогул-жа ўрад выдаткаваў бескантрольна па-за бюджэтам 680 млн. злотых. Ні для каго не таямніца, што сумы, аб якіх гаворыць «Работнік», **у львінай часьці выдаткаваны на ваенныя патрэбы.** Апазыцыя гатова прызнаць урадавыя перавыдаткі, але патрабуе за гэта пэўных уступак і захаваньня дэмакратычных прызваітасьцяй.

(«ИЗВЕСТИЯ»)

НАГНАЦЬ СТРАЧАНЫ ЧАС

ЦК КП(б)Б у кастрычніку месяцы ў сваёй пастанове аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі рэдкалегій насьцэнгазэт падкрэсьліў, што гэтай кампаніі ЦК КП(б)Б **«надае вялікае палітычна-грамадзкае значэньне»,** і прапанаваў усім партыйным, прафэсыянальным і грамадзкім арганізацыям справе правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі **аддаць узмоцненую ўвагу.**

Надрукаваныя ў сёньнішнім нумары газэты матар'ялы аб ходзе кампаніі, сьведчаць аб тым, што цэлы рад райкомаў партыі і ячэек не даацэньвае гэтай важнай кампаніі, змазвае яе палітычнае значэньне, адносіцца да перавыбараў рэдкалегій, як да нейкай непатрэбнай справы.

Ня ўсе таксама нашы акруговыя цэнтральныя газэты аддалі перавыбарчай кампаніі належную ўвагу.

Гэтыя нядбайныя адносіны з боку асобных органаў да пасьпяховага правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі ёсьць простае невыкананьне дырэктыў ЦК КП(б)Б. Такую безадказнасьць у далейшым цярпець нельга.

ЦК КП(б)Б, рэдакцыя газэты «Зьвязда», акругкомы партыі за апошні час далі цэлы рад самых поўных і практычных дырэктыў па пытаньні перавыбарчай кампаніі. На кіраўніцтва скардзіцца ня прыходзіцца. Трэба толькі, каб нізавыя партыйныя органы зразумелі, урэшце, важнасьць, тое вялікае палітычнае значэньне, якое набывае работа рабселькораў і нізавога друку ў нашым сацыялістычным будаўніцтве, зрабілі рашучы пералом у сваіх адносінах да рабселькораўскага руху, паленшылі кіраўніцтва, якое на сёньнішні дзень, трэба адзначыць, нікуды ня вартае.

Сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанавіў працягнуць справаздачна-перавыбарчую кампанію на 2 тыдні, г. зн., да 15-га сьнежня г. г., што дае магчымасьць усім тым арганізацыям, якія да сёньняшняга дня пляліся ў хвасьце ў гэтай справе, нагнаць страчаны час і з посьпехам правесьці кампанію справаздач і перавыбараў рэдкалегій насьцэнгазэт.

У пазачарговы зьезд сэкцыі працаўнікоў друку

Учора ўвечары ў клюбе друкароў адкрыўся зьезд сэкцыі працаўнікоў друку.

Пасьля выбараў прэзыдыуму, у які ўвайшлі т.т. **Лазар, Будзінскі, Асьмоў, Ібінкоўіч, Левін, Шастакоў, Шыпіла** і членаў бюро ЦК КП(б)Б.

На сваім першым пасяджэньні зьезд заслухаў даклад т. Будзінскага аб паданьні ЦК КП(б)Б.

Пад гучныя воплескі зьезд выбраў ганаровы прэзыдыум у складзе т.т. **Сталіна, Калініна, Варашылава, Молатава, Арджанікідзе** і членаў бюро ЦК КП(б)Б.

У фашысцкай Польшчы

Капіталістычная ахова працы

12 лістапада на капальні «Гільдэрбандт» ў Новай Вёсцы ў часе направак у калодзезі да спуску ў капальню выбухнуў пажар, які ўдалося затушыць. 10-га лістапада ў гэтым-жа калодзезі ўпала пад'ёмная скрыня з такою сілаю, што ўкапалася ў зямлю, а другая скрыня завісла ў сярэдзіне калодзезя.

Выпадкі гэтыя прайшлі без ахвяр. У жніўні-ж гэтага году на названай капальні ў часе катастрофы загінула 16 гарнякоў. («Раб.», № 329).

— У гарбарні «Браты Фэйфэр» у Варшаве рабочаму Камінскаму раздушана машынаю правая рука («Раб.», № 323).

— У Варшаве, на фабрыцы мэталёвай «Норблін», Б-ты Бух і Вэрнэр» машынай раздушана правая рука рабочага вальцоўні Кункеля («Работнік», № 324).

Усе гэтыя факты аж надта яскрава гавораць пра ўмовы працы, якія існуюць на прадпрыемствах фашысцкай Польшчы.

ЗА «ЗЬНЯВАГУ» ПІЛСУДЗКАГА

ВАРШАВА, 7. Некалькі месяцаў таму назад у органе выкінутых Пілсудзкім з арміі эндэцкіх афіцэраў і генэралаў «Шанец» быў зьмешчаны артыкул аб адносінах да Пілсудзкага б. вайсковых. Артыкул даводзіў, што Пілсудзкі, як палітык, недалёкабачны і што былыя вайсковыя цяпер не даверылі-б яму лёсаў краю.

Нумар «Шанца» быў канфіскаваны, а рэдактар Р. Васілеўскі прыцягнуты да судовае адказнасьці. Акруговы суд не знайшоў спачатку злачынства ў артыкуле і канфіскацыю зьняў. Але тады асабіста ўмяшаўся б. міністар юстыцыі Мэйштовіч і **той-жа самы суд у тым-жа складзе** засудзіў Васілеўскага на 1 год турмы.

Апэляцыйны суд па скарае абаронцы Васілеўскага—зьменшыў кару да аднаго месяца. Але падсудны падаў яшчэ касацыйную скаргу ў Вярхоўны суд, які прысуд канчаткова зацьвердзіў.

(«Работнік»).

Тардзье—прэмьер-міністар французскага ўраду.

Дарога да Сталінбада



Адкрыцьце чыгункі Дэнаў-Дзюшамбэ

Рабочы і тэхнічны пэрсанал пабудовы чыгункі Дэнаў-Дзюшамбэ ў адзнаку пастановы, ухваленае надзвычайнаю сэсіяю ЦВК Таджыкістану аб стварэньні Саюзнай рэспублікі, падалі першы паравоз на толькі што пабудаванай чыгунцы да чырвонае сталіцы Таджыкістану — Сталінбаду (Дзюшамбэ).

Ня гледзячы на надзвычайныя труднасьці ўмоў работы, дарога была скончана на 2 месяцы раней намечанага тэрміну. Гэта першая дарога Таджыкістану. Эканамічнае і культурнае значэньне яе вялізарнае, яна злучае паміж сабою баваўняныя і збожжавыя раёны. Пабудова дарогі гіганцкімі крокамі прасоўваецца ў глыбіну краю да вызначанага пункту Курган-Цюбэ.

На здымку: паравоз, які толькі што пушчаны па пабудаванай чыгунцы.

Пара скончыць з анты-партыйнай работай правых банкрутаў

МАСКВА. Рэзалюцыі партыйных сходаў у Маскве і іншых гарадох рашуча патрабуюць скончыць з анты-партыйнай работай правых банкрутаў. Маскоўскія партарганізацыі патрабуюць катэгарычна ад пленуму ЦК прыняць арганізацыйныя меры ў адносінах да фракцыянэраў, якія працяглы надарваць жалезную ленінскую дысцыпліну партыі.

Партарганізацыя электразаводу патрабуе ад Бухарына і яго групы адмовіцца ад анты-ленінскіх выступленьняў і прапануе ЦК, у адмоўным выпадку, вывесьці Бухарына са складу палітбюро.

Такія-ж рэзалюцыі ўхвалены камуністымі Краснай Прэсьні, заводзкай яцэйкай «Мономэтр»», заводу імя Калініна і інш.

Бюро Красна-Прэсьненскага райкому, сумесна з прэзыдыумам РЦК рашуча патрабуюць ад Бухарына і яго групы сапраўднай, сумленнай адмовы ад сваіх, асуджаных партыяй і Камінтэрнам, поглядаў. У адмоўным выпадку яны дамагаюцца вываду яго са складу палітбюро.

Сход сакратароў ячэек УсеКП(б) Красна-Прэсьненскай арганізацыі адзначае нясумяшчальнасьць права-апартуністычных поглядаў з прабываньнем у радох ленінскай партыі.

***

ХАРКАЎ, 13. Заслухаўшы даклад генэральнага сакратара ЦК КП(б)У т. Касіёра аб чарговых задачах партыі, нарада партыйнай часткі вышэйшага начскладу Украінскай вайсковай акругі ўхваліла рэзалюцыю, у якой дамагаецца ад пленума ЦК УсеКП(б) ужыць у адносінах да правых фракцыянэраў патрэбныя арганізацыйныя мерапрыемствы, якія намечаны красавіковым пленумам ЦК і 10-м пленумам Выканкому Камінтэрну.

Акрамя таго, гарадзкі партактыў Луганску і куставыя сходы парт'ячэек Смаленскае вобласьці ва ўхваленых рэзалюцыях патрабуюць ад надыходзячага пленуму ЦК УсеКП(б) рэалізаваць пастанову красавіковага пленуму ЦК у адносінах правых апартуністых, якія ня спыняюць фракцыйнай работы.

***

ІВАНАВА-ВАЗЬНЯСЕНСК, 13. Паведамленьні аб апошніх фракцыйных вылазках правай апазыцыі ў Маскве, у Самары і Казані сустракаюць рашучае асуджэньне на сходах партыйных калектываў буйнейшых фабрык. Камуністы 6 ячэек Вялікай Ів.-Вазьнясенскай мануфактуры заяўляюць у рэзалюцыі: **«Правыя тармозяць нашу работу і граюць на руку ворагам рэвалюцыі. Таму мы патрабуем ад ЦК УсеКП(б) прыняць рашучыя меры да спыненьня работы правых».** Падобныя пастановы прынятыя ў радзе іншых калектываў.

***

ТЫФЛІС, 13. Рад камуністычных ячэек розных раёнаў Тыфлісу вынес рэзалюцыі, у якіх рашуча асуджае фракцыйныя вылазкі правых хухілістых. Сходы патрабуюць ад кіруючых партыйных органаў прыняць самыя рашучыя і суровыя меры да спыненьня дзейнасьці правых, ня ўпускаючы ў той-жа час з-пад увагі барацьбы з левымі трацкісцкімі рэцыдывамі.

***

ТАШКЕНТ, 13. Ташкенцкі партактыў прыняў рэзалюцыю, у якой гаворыцца: «Спэкуляцыі правых апартуністых на нашых цяжкасьцях павінен быць пакладзены канец. Пашыраны актыў Ташкенцкай партарганізацыі выказвае ўпэўненасьць, што наступны пленум ЦК УсеКП(б) прыме па гэтым пытаньні неабходныя меры. Актыў Ташкенцкай партарганізацыі лічыць неабходным пры ўпартым адстойваньні т. Бухарыным сваіх памылак і разгортваньні ім фракцыйнай работы, вывесьці яго са складу Палітбюро ЦК УсеКП(б).

***

ХАРКАЎ, 13. Партактывы буйнейшых харкаўскіх фабрык і заводаў, абгаварыўшы пытаньне аб чарговых задачах партыі, патрабуюць палажыць канец вылазкам правых фракцыянэраў. Партактывы патрабуюць, каб на пленуме ЦК УсеКП(б) са ўсёй бальшавіцкай непрымірымасьцю было пастаўлена пытаньне аб прабываньні Бухарына і яго прыхільнікаў у кіруючых органах партыі.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

Пленум бюджэтнай камісіі ЦВК СССР

МАСКВА, 15. Адкрыўся пленум бюджэтнай камісіі ЦВК СССР. Пленум адкрыўся дакладам аб выкананьні бюджэту за 1927-28 год і аб папярэдніх даных па выкананьні бюджэту за 1928-29 год.

Агульныя вынікі выкананьня бюджэту за 1927-28 год добрыя. Мы атрымалі на 7 проц. болш прыбыткаў, чым меркавалі, пры чым перавышэньне прыбыткаў над выдаткамі выявілася ў 205 мільёнаў рублёў. Але адначасова з пасьпяховым выкананьнем усесаюзнага бюджэту былі правалы бюджэтаў саюзных рэспублік. Гэтыя бюджэты, замест меркаванай лішкі ў 6 мільёнаў рублёў, далі дэфіцыт у 92 мільёны.

Бюджэт за 1928-29 год наогул выкананы з некаторым перавышэньнем прыбыткаў над выдаткамі (прыкладна на 5-6 міл. рублёў). За апошнія 5 год мы мелі значнае палепшэньне плянаваных бюджэтаў, але ўсё-ж не пазбавіліся ад прарываў у выкананьні бюджэту. Усё, што мы атрымліваем ад непадатковых прыбыткаў і пазык, ідзе непасрэдна на фінансаваньне народнай гаспадаркі. На гэту-ж мэту мы выдаткоўваем таксама частку падатковых прыбыткаў. Такім чынам усе непадатковыя паступленьні і звыш трэцяй часткі ўсіх падатковых скарыстоўваецца намі для фінансаваньня народнай гаспадаркі. Апошнія $^{2}/_{3}$ часткі падатковых паступленьняў ідуць на сацыяльна-культурныя патрэбы, абарону і г. д. Выдаткі па сацыяльна-культурныя патрэбы растуць з году ў год па ўсіх саюзных рэспубліках. За тры гады гэтыя выдаткі на душу насьцінітва ўзрасьлі ў сярэднім па СССР на 30 проц.

ДЗІЦЯЧЫ УНІВЭРСЫТЭТ У ПЕРМІ

ПЕРМ, 15. Адчынены дзіцячы унівэрсытэт, у задачу якога ўваходзіць распаўсюджаньне навуковых ведаў сярод пралетарскай моладзі. Ва унівэрсытэце будуць чытацца лекцыі аб абароне краіны, авіяцыі, кіно, радыё, спорце, літаратуры і аб нытаньнях бягучай палітыкі. Лекцыі будуць чытаць мясцовыя прафэсары, інжынэры. Ва унівэрсытэце будуць прыймацца падросткі ад 14 да 18 год.

ХІБІНСКІЯ АПАТЫТЫ

Хібінскія месцанараджэньні апатытаў—вялізарнейшыя ў сьвеце. Як сьведчаць буйнейшыя спэцыялістыя, якасьць іх ня ўступае лепшым месцанараджэньням апатытаў за граніцаю.

На Хібінскіх месцанараджэньнях працягваюцца работы па сьвідраваньні **Сьвідраваньне першай прабоіны дасягнула 180 мэтраў, але да канца пласту яшчэ не дайшлі. Увесь час ідзе чысты апатыт.**

Заключаны дагавор з буйнейшым хэмічным канцэрнам Нямеччыны на продаж хібінскіх апатытаў. Узарвана некалькі дзесяткаў тысяч тон апатытавага пласту.

ПАРАВОЗЫ НОВАЙ СЭРЫІ

На Ленінградскім заводзе «Красный Путиловец» на працягу доўгага часу вялася работы па праектаваньні новага паравозу вялікай магутнасьці. Работы скончыліся пасьпяхова. Завод прыступіў да масавага выпуску гэтых паравозаў.

Амэрыканскія рабочыя падпісваюцца на 3-ю пазыку індустрыялізацыі

ЛЕНІНГРАД, 15. На пашыраным паседжаньні прэзыдыуму саюзу мэталістых падпісаны палітычны дагавор паміж дэлегацыямі рабочых мэталістых Амэрыкі і Англіі з рабочымі бальтыцкага заводу.

Рабочыя бальтыцкага заводу бяруць на сябе абавязацельствы «быць у першых радох актыўных будаўнікоў сацыялізму і за 4 гады выканаць пяцігадовы плян».

Дэлегацыя-жа амэрыканскіх і ангельскіх рабочых і прадстаўнікі саюзных арганізацый абавязуюцца ўсямерна садзейнічаць пашырэньню сувязі рабочай клясы сваёй краіны з рабочымі СССР, весьці рэвалюцыйную бярацьбу за вызваленьне рабочае клясы з-пад ярма капіталізму, захоўваць СССР ад спроб узброенага нападу капіталістых, весьці актыўную барацьбу супроць фашыстых і сацыял-здрадніцкіх і г. д.

Удзельнікі амэрыканскай дэлегацыі асабліва цікавіліся III-й пазыкай індустрыялізацыі. Многія амэрыканскія рабочыя даручылі ім даведацца аб умовах набыцьця пазыкі. Гэтыя рабочыя арганізуюць на заводах калектыўную падпіску на пазыку. Па прапанове амэрыканскіх дэлегатаў пастаноўлена зьвярнуцца ад імя саюзу мэталістых да рабочых мэталістых Амэрыкі з прапановаю пырска разгарнуць узьнікшую ў іх ініцыятыву.

Падарунак амэрыканскіх рабочых СССР

МАСКВА, 15. УсеЦСПС атрымаў учора за подпісам старшыні «таварыства прыяцеляў СССР у Амэрыцы» тав. Гібарці тэлеграфнае паведамленьне, што амэрыканскімі рабочымі накіроўваецца ў СССР падарунак—15 трактараў. Тав. Гібарці просіць хуткага паведамленьня адрасу кампаніі, куды трактары павінны быць пасланы.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПАБУДОВЫ МАГУТНАГА АЛЮМІНІЯВАГА КАМБІНАТУ

ЛЕНІНГРАД, 15. Пачаліся папярэднія работы па падрыхтоўцы да пабудовы магутнага алюміняівага камбінату пад Ленінградам. У Нямеччыну выехала 5 інжынэраў «Гипромеза», якім даручана пракансультаваць з выдатнымі нямецкімі спэцыялістымі праект заводу. Выбраны ўжо пляц для будучага камбінату на правым беразе ракі Волхава, крыху вышэй Волхаўбуду. Прадукцыйнасьць алюміняівага камбінату—5 тысяч тон у год.

Савецкім паслом у Лёндане назначаны тав. Сакольнікаў

МАСКВА, 16. Вялікабрытанскі ўрад афіцыйна паведаміў ўрад СССР аб назначэньні ангельскім паслом у Маскву сэра Эсмонда Овій. Урад СССР паведаміў Вялікабрытанскі ўрад, што паслом СССР у Лёндане назначан т. САКОЛЬНІКАЎ. Ободва ўрады далі згоду на гэтыя назначэньні.

Папярэднія даныя аб ходзе хлебазагатоўчай кампаніі

МАСКВА, 15. Наркамгандлем СССР атрыманы папярэднія даныя аб ходзе хлебазагатовак ад пачатку кампаніі па 10-га лістапада. Усяго па СССР гадавы плян па загатоўках збожжавых культур (бяз збору за памол) выкананы на 89,6 проц. Гадавы плян загатовак спажывецкіх культур па ўсім Саюзе выкананы ў разьмеры 54,8 проц.

Вынікі праверкі апарату Акадэміі Навук СССР

ЛЕНІНГРАД, 13. Камісіяю па праверцы апарату Акадэміі Навук зьняты з работы па другой катэгорыі Менажэўскі, супрацоўнік музэю антрапалёгіі і этнаграфіі, і вучоныя-ахоўцы Пушкінскага дому М. В. Ізмайлаў і Н. Т. Кулаеў. Зьняты таксама Молас (камісія экспэдыцыйных досьледаў) і А. Каванько (Пушкінскі дом). Здымаюцца з адміністрацыйных пасад Андрэеў (выдавецтва Акадэміі Навук) і Галадзед (камісія па гісторыі фабрык пры акадэміі).

Выкрыты магутныя паклады руды алюмінія

САРАТАЎ, 13. У Бельску выкрыты магутныя паклады руды алюмінія і жалеза.

ГІГАНЦКІ КАЛГАС

У Новасёлкаўскім раёне, Краснаярскай акрузі, у выніку сацыялістычнага спаборніцтва, арганізаваны гіганцкі калгас. Ён аб'яднаў 11 сёл з 1.320 двароў.

Калгасу перададзена плошча корнай зямлі ў 12 тысяч гэктараў, якая будзе даведзена да 65 тысяч гэктараў.

Для апрацоўкі зямлі калгасу выдзелена 48 трактараў.

ПАКЛАДЫ ЖАЛЕЗА

Геалёгічны камітэт выслаў у Сібір разьведвальную партыю. Пасьля доўгіх пошукаў гэта партыя выявіла ў раёне сяла Потаскун паклады высокагатункового жалеза, выключнага па якасьці.

Пласт

На Менскай акруговай канфэрэнцыі груп беднаты

Групы беднаты—барацьбіты за калектывізацыю вёскі

Менская акруговая канфэрэнцыя груп беднаты заслухала даклад старшыні менскага АВК т. Аксючыца аб развіцьці народнай гаспадаркі і культуры БССР і ў Менскай акрузе.

— Наша народная гаспадарка, — складае значае т. Аксючыц, — расьце вельмі марка, шпарчэй, чым любая буржуазная краіна.

Па сельскай гаспадарцы на 29-30 год бел, зваставлена задача павялічыць пасеўную плошчу на 4 проц., узьняць ураканайнасьць у індывідуальных гаспадарствах на 20 проц., калгасах — 25 проц. і калгасах — 35 проц. Па Менскай акрузе плошча пад калгасы будзе павялічана да 132 тыс. гэкт. з разьлікам, каб жны калгас займаў ня менш 550 гэкт. паставілі перад сабой задачу, каб менш 15 проц. усёй зямельнай плошчы акругі было занята аграмаджаным ктарам. Каб дасягнуць гэтага, патрэбна пакласьці шмат энэргіі і сіл, бо на акруга адстала ў галіне калектывізацыі. Рост мясцовай прамысловасьці вінен быць павялічаны на 50 проц. у раўнаньні з мінулым годам. Прадукцыйнасьць працы павялічыцца на 16%, рабочых, занятых у мясцовай прамысловасьці, — на 19 проц. Рост прамысловасьці БССР на бягучы год намечаны ў 60 проц., лік рабочых павялічыцца на 28 проц.

Усе гэтыя лічбы сьведчаць аб буйным наступе нашай гаспадаркі.

Клясавая барацьба на вёсцы за апошні час значна абвастрылася. Кулак усялякімі мерамі і шляхамі стараецца сарваць нашае сацыялістычнае будаўніцтва. Яму часамі, пад маскай серадняка, удаецца пралезьці ў савецкі апарат, дзе ён перашкаджае і зрывае нашу работу. Перад групамі беднаты стаіць задача выявіць гэтых скрытых ворагаў і навесьці з імі рашучую барацьбу.

Тав. Аксючыц далей спыняецца на дзе хлебазагатовак у акрузе. У раёнах раёнаў наглядалася скажэньне клясавай лініі пры правядзеньні заготовак. радзе мясцовасьцяй былі выпадкі, лі пляны выконваліся ў большасьці кошт бяднаты і серадняку, а кулацтва ўхілялася ад выкананьня імі вёрдых заданьняў.

Адзіным шляхам узьняцьця сельскае гаспадаркі, — заканчвае т. Аксючыц, — ёцца шлях калектывізацыі. **Групы беднаты павінны зьявіцца шчырымі барацьбітамі за калектывізацыю сельскай гаспадаркі.**

Даклад т. Аксючыца выклікаў гарачае спрэчкі, якія заняли ўсё ранішняе сяджэньне канфэрэнцыі. Выступаюць ня сяляне адзначылі адсутнасьць кіраўніцтва работай груп беднаты, недаволены ў рабоце нізавых органаў, і імянна беднаты ісьці ў калгасы.

— Няма належнага кіраўніцтва групаю беднаты, — кажа селянін т. Рудакоў, — ясьняючы чаму работа груп часта спынена. На мясцох існуе яшчэ цыганіна, ізм і пратэкцыянізм. Да гэтага

Дэлегаты абіраюць прэзыдыум зьезду. У авале—тыр дэлегата.

часу ў нашым раёне агрэмінімум яшчэ не праводзіцца. Новы зямельны кодэкс вісіць на сьцяне ў сельсавеце, але абгаварэньне і растлумачэньне яго не праводзіцца.

У сваім дакладзе т. Аксючыц, — кажа дэлегат Рудакоў, — адзначыў, што наша акруга адстае ў тэмпе калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Мы, беднота, даўно-б ужо ўступілі ў калгасы. Імкненьне да арганізацыі калгасаў з боку бядняцкага сялянства наглядалася даўно, але да гэтага часу нам перашкаджалі Прышчэпавы, Масальскія і Лабаноўскія, якія праводзілі яўна-кулацкую палітыку.

Хуткая калектывізацыя нашай гаспадаркі,—адзначае сялянка Балтыцкая, — гэта асноўная задача беднаты. Жанчына, якой Кастрычнік даў сапраўдную свабоду, павінна быць першай у барацьбе за калектывізацыю сельскай гаспадаркі, за калгасы.

Сялянка Дударэнка адзначае, што на вёсцы мала вядзецца растлумачальная работа аб умовах жыцьця ў калгасах. Кулак выкарыстоўвае нашу несьвядомасьць і палохае беднату ўсялякімі выдумкамі і страхамі аб жыцьці калгасаў. Трэба павесьці шырокую растлумачальную работу аб мэтадах работы і формах арганізацыі калгасаў.

Цікавыя факты, якія сьведчаць аб тым, што кулак яшчэ ня здаў усіх сваіх хлебных лішкаў, падаў т. Тоўсьцік і іншыя сяляне.

Кулак, якому сход вызначыў здаць 150 пуд. хлеба, крычыць аб тым, што на заўтра яму няма чаго есьці. А калі да яго прыехаў ксёндз, ён яму наклаў воз у 25 пуд. хлеба. Ужо пасьля здачы хлеба многія кулакі, якія крычалі аб тым, што ў іх забралі ўсе лішкі, для хрэсьбін і інш. гульняў пераганяюць дзесяткі пудоў хлеба на самагонку.

Тав. Лобач падкрэсьлівае патрэбнасьць больш рашучай барацьбы з кулацтвам, якое наглее і перашкаджае ўсім нашым пачынаньням і будаўніцтву. Настаўніцтва яшчэ слаба зьвязана з вёскай. Бываюць выпадкі, калі асобныя настаўнікі ў вёсцы выступаюць супроць калектывізацыі.

Селянін Барысаўскага раёну т. Паплавец зазначае, што трэба больш строга падыходзіць да прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, бо сярод выпусканых спэцыялістых ёсьць вялікі процант кулацкіх сыноў, якія ня хочуць нам дапамагаць.

Прышчэпаўшчына, — кажа селянін Гуляй, Заслаўскага раёну, — яшчэ жыве ў нашым раёне. Калі бедняки зьвяртаюцца ў раён за дапамогай аб арганізацыі калгасу, яны не атрымліваюць ніякай дапамогі і паказаньняў.

***

Канфэрэнцыяй паслана прывітальная тэлеграма ЦК КП(б)В наступнага зьместу:

«Лепшаму абаронцы батрацка-бядняцкіх інтарэсаў, вернаму правадыру рабочае клясы і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, кіраўніку індустрыялізацыяй краіны і рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі на грунце калектывізацыі, Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Беларусі Менская акруговая канфэрэнцыя груп беднаты шле шчырае братэрскае прывітаньне. Канфэрэнцыя запэўняе ЦК у тым, што беднота Менскай акругі будзе рабіць усё для таго, каб у найкарацейшы тэрмін калектывізаваць сельскую гаспадарку. Усе кулацкія і варожыя элемэнты, што паспрабуюць перашкодзіць справе калектывізацыі, сустрэнуць з боку беднаты самы жорсткі адпор.

Няхай жыве сталёвае адзінства УсеКП(б)!

Няхай узмацняецца пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі саюз рабочае клясы з бядняцка-серадняцкай масай сялянства».

Пачынаньне Кастрычніцкага райкому КП(б)Б

Арганізуецца вялікая брыгада для падрыхтоўкі веснавой пасеўнай кампаніі

Зараз ужо распачалася работа па веснавой пасеўнай кампаніі. Ад таго, як мы падрыхтуемся ў галіне гаспадарчай, арганізацыйнай і палітычнай і ад таго, як мы падымем палітычную актыўнасьць батрацтва, беднаты і серадняку, будзе залежаць яе посьпех.

Трэба мець на ўвазе, што кулак і нэпман прымуць усё для таго, каб затрымаць тэмп калектывізацыі, паспабіць усю падрыхтоўку да веснавой пасеўнай кампаніі. Кулак паспрабуе зрабіць уплыў на паасобныя групы серадняку у напрамку скарачэньня пасеўных плошчаў, скарачэньня з сярэдзіжывёлагадоўлі, разпажэньня з сярэдзіны калгасаў і г. д.

Маючы на ўвазе ўсе гэтыя меркаваньні, Кастрычніцкі райком КП(б)Б гор. Менску прыняў пастанову:

Вылучыць ад раёну брыгаду для пасылкі ў вёску ў дапамогу вясковым парт'ячэйкам у падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі, па разгортваньні работы сярод беднаты і паскарэньні тэмпу калектывізацыі.

Брыгада выбіраецца на адкрытых партыйных сходах. Яна паступае ў распараджэньне акруговага камітэту партыі для разьмеркаваньня па раёнах і вёсках.

Гэта толькі пачатак арганізацыйнай пралетарскай дапамогі з боку нашага раёну. Патрэбна будзе гэту форму дапамогі ў вёсцы зрабіць пастаянна дзейнай па лініі шэфства.

Важнасьць такой меры ясная. Яна павінна яшчэ больш падняць актыўнасьць батрацтва і беднаты і адказнасьць пралетарскіх мас за работу ў вёсцы.

Н. Г.

Антырэлігійны унівэрсытэт пачаў работу

Прыступіў да работы антырэлігійны унівэрсытэт, які арганізаваны цэнтральным саветам ваяўнічых бязбожнікаў сумесна з бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў.

Арганізацыя гэтага унівэрсытэту зьяўляецца вельмі своячасовым і цільным мерапрыемствам. Мы на кожным кроку адчуваем недахоп у работніках па антырэлігійнай працы. Да гэтага часу барацьба з рэлігіяй праводзілася кампанейскім парадкам. Трэба наладзіць сталую, сыстэматычную антырэлігійную прапаганду. Гэтага мы не маглі дасягнуць, бо адсутнічалі адпаведныя кадры, якія-б кіравалі гэтай работай на прадпрыемствах, у клюбах, у школах і г. д.

Рэлігія і клерыкалізм павінны ў нашай краіне выкарчоўвацца, выкараняцца разам з выкараньненьем усіх рэшткаў капіталізму. Арганізацыя антырэлігійнага унівэрсытэту—гэта мерапрыемства павінна быць і будзе яшчэ адным ўдарам для старога быту.

Невыпадкова за справу арганізацыі антырэлігійнага унівэрсытэту ўзялося таксама і бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў, якое вызначыла для работы ў ім лепшых сваіх членаў. Лепшыя навуковыя сілы нашай эпохі асабліва адчуваюць, што навука і рэлігія ніяк ужывацца ня могуць, што адно супрацілегла другому, **што адно другому ў корані супярэчыць**, што рэлігія ў эпоху культурнай рэвалюцыі зьяўляецца адным з вялікіх каменьчуў, якія ляжаць на нашым шляху.

Навакол антырэлігійнага унівэрсытэту і лепшай пастаноўкі работы ў ім павінна быць згуртавана ўвага ўсіх рабочых арганізацый, усей савецкай грамадзкасьці. Наркамасьветы, акадэмія навук, прафсаюзы павінны прыйсьці на дапамогу антырэлігійнаму унівэрсытэту.

М. КАЛМЫК.

КП(б)Б ДАЕ РУЙНУЮЧЫ АДПОР ПРАВЫМ КАПІТУЛЯНТАМ

ПАКУЛЬ ПРАВЫЯ АПАЗЫЦЫЯНЭРЫ НЕ АДМОВЯЦЦА АД СВАІХ ПАКЛЁПНІЦКІХ НАПАДКАЎ НА ПАРТЫЮ І НЯ ПРЫЗНАЮЦЬ ПОЎНАСЬЦЮ ПАМЫЛКОВАСЬЦЬ СВАЁЙ КАПІТУЛЯНЦКАЙ ПАЗЫЦЫІ, БАЛЬШАВІЦКАЯ ПАРТЫЯ БУДЗЕ ВЕСЬЦІ З ІМІ НЕПРЫМІРЫМУЮ БАРАЦЬБУ

Яшчэ больш узмацніць змаганьне з правым апартунізмам і прымірэнцтвам, адначасова не паслабляючы барацьбы з „левымі“ наскокамі на лінію партыі

Барацьбу з правымі банкрутамі давядзем да канца

Суровы адпор партыйных арганізацый прымушае правых ухілістых зьмяніць сваю тактыку. Пад відам знадворнай салідарнасьці з лініяй партыі яны хочуць перастроіць свае рады, каб пры першых гаспадарчых затрудненьнях выступіць у поўным узбраеньні сваёй апартуністычнай пляцформы. Яны нават гатовы асьцярожна прызнаць, што да некаторай ступені (?!) недаацанілі элемэнтаў падёму рабочае клясы. Дзякуючы нячуванаму росту актыўнасьці мас, мы маем вялізныя дасягненьні. Прызнаючы гэтыя дасягненьні,—яшчэ-бы не хапала іх ня прызнаць!—у справе выкананьня пяцігодкі ў абсягу будаўніцтва калгасаў і саўгасаў і г. д., яны прабуюць намаляваць справу так, быццамбы жыцьцё зьняло разгалосьсі. Але хіба даволі заявіць аб нашых посьпехах, каб лічыць, што жыцьцём зьняты разгалосьсі. Мы ведаем, што цэлы рад буржуазных карэспандэнтаў быў вымушаны прызнаць вялізарнейшыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва. Але хіба на гэтай падставе мы можам заявіць, што жыцьцё зьняло нашы разгалосьсі з лібэральнай буржуазіяй?

Правыя абвінавачвалі партыю ў спаўзаньні на пазыцыю трацкістых. Ці зьнімаюць яны гэту паклёпніцкую заяву цяпер, заяўляючы аб згодзе з лініяй партыі? Ці зьнімаюць яны сваю заяву, што кіраўніцтва вядзе краіну да галаду? Ці зьнімаюць яны сваё цьверджаньне, што партыя насаджае бюракратызм? Ці адмаўляюцца яны ад свайго паклёпу, быццам-бы рабочая кляса адыходзіць ад партыі? Ці прызнаюць яны памылковымі свае выступленьні ў абарону згортваньня нашай барацьбы з кулацтвам? Ці прызнаюць яны памылковымі свае выступленьні, накіраваныя супроць разьвіцьця калгаснага руху, супроць хуткага будаўніцтва саўгасаў? Ці прызнаюць яны памылковай сваю стаўку на індывідуальную гаспадарку!

Калі прыслухацца да апошніх выступленьняў правых, дык стане зусім асным, што яны ад сваіх старых абвінавачаньняў не адмаўляюцца. Наадварот, крывадушна і двурушна заяўляючы аб згодзе з лініяй партыі, яны ў той-жа час падкрэсьліваюць, што калі-б партыя прыслухалася да іх парад, дык посьпехі былі-б яшчэ большыя. Цяжка вызначыць, чаго больш у гэтай заяве—палітычнай сьлепаты, ці разьвязнай самаўпэўненасьці.

Правыя робяць выгляд, быццам-бы яны забылі аб існаваньні рэзалюцый партыі і Камінтэрну, якія канстатуюць наяўнасьць дзьвёх нясумяшчальных і няпрымірымых ліній: лініі партыі і Камінтэрну, з аднаго боку, і лініі бухарынскай апазыцыі—з другога.

Жыцьцё паказала ганэбнае банкрутства лініі правых і бясспрэчную правату лініі партыі і Камінтэрну.

Правыя павінны былі выбіраць: або застацца на сваёй апартуністычнай пазыцыі і тады канчаткова парваць з партыяй і Камінтэрнам, або безагаворачна парваць і да канца адмовіцца ад гнілой апартуністычнай лініі правага ўхілу. Але яны не пажадалі выбіраць. Яны палічылі за лепшае пайсьці на дыплёматычныя выкруваньні. Упарта абараняючы свае погляды, правыя перашкаджаюць хуткаму сацыялістычнаму наступленьню. Асноўныя посьпехі ў галіне гаспадарчага жыцьця і міжнароднай палітыкі былі дасягнуты ня толькі наперакор, але і ў рашучай барацьбе з правымі. Пакуль правая апазыцыя поўнасьцю і бясспрэчна, бяз усякіх недагаворанасьцяй, не адмовіцца ад усіх сваіх паклёпніцкіх нападак на партыю, ад усіх сваіх апартуністычных прапаноў, пакуль яна выразна ня прызнае сваіх карэнных памылак па ўсіх асноўных пытаньнях, да таго часу партыя можа гутарыць з ёю толькі мовай непрымірымай барацьбы.

Жорстка прасякаючы фракцыйныя вылазкі прыхільнікаў т. Бухарына, бязьлітасна выкрываючы дыплёматычную гульню правых банкрутаў, партыя давядзе барацьбу з правымі апартуністымі да канца.

(«Правда»).

ПОГЛЯДЫ ПРАВЫХ НЕСУМЯШЧАЛЬНЫ З ЛЕНІНІЗМАМ

Віцебскі партактыў патрабуе ад групы тав. Бухарына поўнага прызнаньня сваіх памылак

Пасьпяховае выкананьне першага году пяцігодкі, якое ўжо зараз дало магчымасьць запраектаваць выкананьне пяцігадовага пляну ў больш кароткі тэрмін, выклікала новы выбух супраціўленьня капіталістычных элемэнтаў сацыялістычнаму наступленьню.

Дасягненьні першага году пяцігадовага пляну, якія выявіліся ў росьце цяжкой індустрыі, бурным павялічэньні тэмпу калектывізацыі і разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва, яшчэ раз давялі правільнасьць генэральнай лініі партыі і дашчэнту разьбілі тэорыі правай бухарынскай апазыцыі. Абвастрэньне клясавае барацьбы, пасьпяховае сканчэньне першага году пяцігодкі, здавальняючы ход хлебазагатовак і напіск на кулака, правал антыпартыйных поглядаў бухарынскай апазыцыі—усё гэта выклікала новую арганізаваную фракцыйную вылазку правых капітулянтаў (**Сьляпкоў, Айхэнвальд, ананімныя лістоўкі і г. д.**).

Асобныя заявы кіруючых таварышоў, што ўваходзяць у склад бухарынскай групы, аб тым, што яны згодны з генэральнай лініяй партыі, пры поўным нежаданьні змагацца з правым ухілам—зьяўляюцца недапушчальнымі і двудушніцкімі. Такая маўклівасьць і нежаданьне змагацца з правымі апартуністымі недапушчальны для членаў і кандыдатаў партыі.

Таму партактыў Віцебскай арганізацыі, вітаючы ЦК УсеКП(б) за яго непрымірымую барацьбу з правымі і прымірэнцамі, патрабуе ад пленуму ЦК УсеКП(б) ужыць супроць правых фракцыянэраў арганізацыйныя меры.

Толькі бязьлітасная барацьба з правымі і прымірэнцамі забясьпечыць пасьпяховае выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Спыніць фракцыйную дзейнасьць правых

Раённы сход Дрысенскай арганізацыі КП(б)Б канстатуе, што:

— Шпаркі тэмп сацыялістычнага будаўніцтва і буйныя посьпехі па індустрыялізацыі нашай краіны і рэканструкцыі сельскае гаспадаркі дашчэнту разьбілі тэорыю правых апартуністых.

— Сход рашуча і рэзка асуджае фракцыйную дзейнасьць правых капітулянтаў, якія ня спыняюць сваёй барацьбы супроць лініі партыі і Камінтэрну.

— Сход патрабуе ад ЦК УсеКП(б) ужыць арганізацыйныя меры ў адносінах да правых фракцыянэраў.

Даволі перасьцярог

Агульны сход партыйнага калектыву аб'яднанай Беларускай вайсковай школы імя ЦВК БССР адзначае, што посьпехі, якіх дасягнула партыя, пад ленінскім кіраўніцтвам ЦК, за першы год пяцігодкі, зьяўляюцца найлепшым абвяржэньнем поглядаў усіх правых апартуністых на чале з т. Бухарыным.

Аднак, правыя, замест прызнаньня памылковасьці сваіх поглядаў, перайшлі на шлях фракцыйнай барацьбы з партыяй.

Таму калектыў, рашуча асуджаючы апошнія фракцыйныя вылазкі правых капітулянтаў, патрабуе ад пленуму ЦК УсеКП(б) ужыць энэргічныя арганізацыйныя меры ў адносінах правых фракцыянэраў, якія ня спыняюць сваёй барацьбы супроць лініі партыі і Камінтэрну.

Сход завастрае ўвагу ўсіх членаў партыі на патрэбнасьці яшчэ больш разгарнуць барацьбу з канкрэтнымі правямі правага апартунізму і прымірэнцтва, адначасова не паслабляючы барацьбы з «левымі» наскокамі на лінію партыі.

ШЫРЭЙ ФРОНТ БАРАЦЬБЫ З ПРАВЫМ АПАРТУНІЗМАМ

Мазырская партарганізацыя аб палітычных памылках гандлёва-каапэрацыйнай ячэйкі

Чыстка парт'ячэйкі гандлёва-каапэрацыйных устаноў (Мазыр) паказала, што ячэйка не змагалася з канкрэтнымі правамі правага ўхілу і прымірэнцтва, з скажэньнямі клясавай лініі і бюракратызмам.

Мазырская партарганізацыя зрабіла палітычныя вывады з урокаў чысткі ячэйкі і заклікала ўсіх членаў партыі да ячэй больш рашучай і бязьлітаснай барацьбы з правымі і прымірэнцамі за лінію партыі

«Зьвязда» пісала ўжо аб чыстцы ячэйкі КП(б)Б мазырскіх гандлёва-каапэрацыйных устаноў і арганізацый. Чыстка выкрыла цэлы рад адмоўных зьявішч і апартуністычных скажэньняў у практыцы ячэйкі. Прымірэнцтва да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі, нерашучая невыстарчальная барацьба з канкрэтнымі праявамі правага апартунізму, шавінізм, антысэмітызм ня сустрэлі своячасовага і жорсткага адпору з боку партыйнай ячэйкі. Асобныя працаўнікі—камуністыя, якія аб'яднае ячэйка, у сваёй рабоце фактычна праводзілі правую лінію і скажалі клясавую палітыку партыі і савецкай улады.

Праўленьне ЦРК, аддзяленьне Белдзяржгандлю, праўленьне сампрамкаапэрацыі дапусьцілі правыя скажэньні і бралі стаўку на «здаровага» прыватніка, нэпмана і кулака. Бюро парт'ячэйкі не рэагавала на ўсе гэтыя факты, праявіўшы пытаньні недапушчальную бязьдзейнасьць. У самой ячэйцы таксама мелі месца хваравітыя зьявішчы, антыпартыйныя ўчынкі і г. д. Замест бальшавіцкай згуртаванасьці і мабілізацыі сіл на выкананьне чарговых задач партыі, у ячэйцы мелі месца групоўкі, падсядваньне, шавіністычныя настроі, скажэньні дырэктыў партыі.

Праверком выключыў з партыі тых, хто скажаў лінію партыі і абараняў інтарэсы клясавага ворага. Чыстка аздаровіла ячэйку і дапамагла ёй стаць на правільны партыйны шлях. Але трэба адзначыць, што асобныя камуністыя імкнуліся дыскрэдытаваць праверком, каб зьменшыць сваю віну за права-апартуністычныя скажэньні і антыпартыйныя ўчынкі і каб сарваць праверку і чыстку ячэйкі.

Супроць праверкому было высунута паклёпніцкае абвінавачаньне ў тым, нібы праверком тэндэнцыйна падыходзіць да камуністых-яўрэяў, дапускае грубыя памылкі пры чыстцы асобных камуністых і г. д. Усё гэта зьяўляецца наглым паклёпам, агідным спробам дыскрэдытаваць праверком, каб змазаць палітычныя памылкі ячэйкі, каб прыпісіць значэньне чысткі.

Мазырская гарадзкая арганізацыя рашуча асудзіла гэтыя спробы і завастрыла сваю ўвагу на барацьбе з канкрэтнымі правямі правага ўхілу і прымірэнцтвам на прыкладзе справы гандлёва-каапэрацыйнай парт'ячэйкі.

Адбыўся агульны партыйны сход Мазырскай арганізацыі, які даў палітычную ацэнку вынікам чысткі ячэйкі КП(б)Б гандлёва-каапэрацыйных устаноў Мазыра. Сход аднадушна ўхваліў рэзалюцыю, у якой гаворыцца:

Агульна-гарадзкі сход Мазырскай арганізацыі КП(б)Б, заслухаўшы даклад аб выніках чысткі ячэйкі гандлёва-каапэрацыйных устаноў, адзначае, што ячэйка не праводзіла рашучай барацьбы з канкрэтнымі праявамі правага ўхілу і прымірэнцтвам да яго. Ячэйка не змагалася з правымі скажэньнямі ў практыцы асобных гандлёва-каапэрацыйных устаноў (ЦРК, аддзяленьне Белдзяржгандлю і г. д.), дзе мелі месца антысэмітызм, яўрэйскі шавінізм, зрастаньне з нэпманамі і клерыкаламі, абарона інтарэсаў прыватнага капіталу і г. д. Парт'ячэйка не вяла барацьбы з бюракратызмам ва ўстановах.

Сход асабліва падкрэсьлівае слабасьць самакрытыкі ў ячэйцы. Праверкамісія праводзіла правільную лінію і рашуча выкрыла канкрэтных носьбітаў правага ўхілу і прымірэнцтва. Сход адзначае, што ў часе чысткі ячэйкі і асабліва пры абмеркаваньні вынікаў праверкі, асобныя камуністыя гарадзкой арганізацыі прымірэнча адносіліся да выкрытых права-апартуністычных скажэньняў і прымірэнцтва ў ячэйцы. Значная частка партыйцаў, што прысутнічалі на чыстцы, не дала адпору паклёпніцкім вылазкам клясава-варожых элемэнтаў, якія прабавалі дыскрэдытаваць праверачную камісію і сарваць чыстку ячэйкі.

Сход рашуча і катэгарычна адхіляе спробы абвінаваціць праверкамісію ў аднабокіх адносінах да камуністых-яўрэяў.

Сход арганізацыі лічыць гэтыя абвінавачаньні беспадстаўнымі, і што яны (абвінавачаньні) зьяўляюцца вынікам дробна-буржуазнага ўплыву на асобных партыйцаў, якія падпалі пад гэты ўплыў. У заключэньне сход заклікаў усіх членаў і кандыдатаў партыі да яшчэ большай і жорсткай барацьбы з правымі ўхілу і прымірэнцтвам.

Сход падкрэсьліў «патрэбнасьць яшчэ большай і бязьлітаснай барацьбы з ухіламі ад лініі партыі, з правымі шавінізму ўсіх колераў, нацыянал-дэмакратызму, рашучага разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі, ня гледзячы на асобы».

Курсы для выдучэнцаў пры ЦК КП(б)Б адкрываюцца 20-га лістапада

Курсы для выдучэнцаў пры ЦК КП(б)Б адкрываюцца 20-га лістапада. Усяго на курсы прынята 115 камуністых—рабочых ад варштату. З ліку прынятых — 85 мужчын і 30 жанчын. Па партстажы сярод прынятых: 1 да 1917 г., 36 уступілі ў партыю ў 1917-24 г.г. і 78 — у 1925 г. і пазьней. Сярод прынятых 7 чал. маюць вытворчы стаж да 10 год, 58 чал. — ад 10 да 15 год і 50 чал. — звыш 15. Па нацыянальнасьці ў ліку прынятых — 71 беларус, 33 яўрэі, 6 расійцаў і 5 іншых. У Чырвонай арміі служылі 58 чал.

Для акадэмічнага і партыйна-палітычнага кіраўніцтва курсамі створаны савет у складзе 5 асоб, у які ўваходзяць т.т. ГАНТМАН, КАРАСЬ, ЛУР'Е, ГУРЫНОВІЧ і адзін прадстаўнік ад курсантаў. Сакратарыятам ЦК КП(б)Б зацьверджаны навучальны плян курсаў і склад выкладчыкаў. Заняткі курсаў будуць адбывацца ў аўдыторыях Камунарскага ўніверсітэту.

Курсы будуць пачаты ня пазьней 20-га лістапада. На курсах, апрача захаваньня за курсантамі акладу зарплаты па іх стапай працы, выдаецца харчаваньне, памяшканьне, пожак з пасьцельнымі прыладамі.

З Гомельскай акругі прынята на курсы 19 чал., з Віцебскай — 19 чал., з Бабруйскай — 9, з Магілеўскай — 10, з Аршанскай — 9, з Мазырскай — 6, з Полацкай — 5.

З Менскай акругі прыняты наступныя т.т.: МЛОДЗІНАЎ, ЯНУШКЕВІЧ, АДЛЕРШТЭЙН, АЛЕКСАНДРОВІЧ, ПАТОЦКІ, НЯХАЙЧЫК, ЖАРДЗЕЦКІ, НАВІЦКАЯ, ЛУЦКЕВІЧ, ЛЕВІНА, ТАБЯЛЬЧУК, ГАЕЎСКІ, БАБУЛЯК, БУРШТЭЙН, КАНДАРЧУК, ФАРБОТКА, СЬЦЯПАНАЎ, КАМЗЯКА, ШВЭДКА, ТАЧКО, БАЧЫШЧА, КАЛЕСЬНІКАЎ, КУНЦЭВІЧ, ІВАНОЎСКІ, СУБАЧ, КА-

Кастрычніцкі „падарунак“ Б. Д. Выдавецтва

(„Кастрычнік у хаце-чытальні“ Д. ХАЙТУНА)

Нядаўна мы адсьвяткавалі 12 гадавіну Кастрычніка. Мы напросім у нашага чытача на хвілінку зноў вярнуцца к часам падрыхтоўкі сьвяткаваньня. Напэўна ён заходзіў тады ў нашы кнігарні і пытаўся: «Ці няма ў вас чаго-небудзь пра Кастрычніка—брашур, п'ёс, інсцэнізак?».

— Ведаеце, а нічаўткі. Вось хіба любны зборнічак 1923 году. Можа сёе-тое знойдзеце.

Калі адбываліся такія дыялёгі ў кнігарнях, мы, дзівакі, ня ведалі, што ў нас самы час БДВ сьпішалася з вёскам патрэбнай нам кніжкі. Праўда, каторыя кажуць, што, ня гледзячы на спешку, гэта кніжка вышла, як і трэба было чакаць за 2-3 дні да сьвята. Нядзелі-то-ж, ня вышла да 12-ай гадавіны, то патрэбіцца ў 13-ую. Мы-ж ня зьбіраемся, бач, намірацъ.

І так, Кастрычніцкі падарунак Белдзяржвыдавецтва вышаў нуўдалым. Назва гэтага падарунку наступная. **«Кастрычнік у хаце-чытальні»**, аўтар **Д. Хайтун.** Старонак 156. Цана 60 к. Тираж 10.000.

Перш, чым прыступіць да разбору пасьцяй друкаванага падарунку, мы-б хацелі нашаму чытачу прыпомніць асноўныя лёзунгі ЦК партыі да Кастрычніцкай гадавіны—гэта яму патрэбна будзе далей.

Дык вось Д. Хайтун (як аўтар, ён нам вядомы) сваім зборнікам хацеў прыйсьці на дапамогу нашаму хатнику і дацьмі ў мэтадычных і мастацка-літаратурных тар'ял па афармленьні сьвяткаваньня Кастрычніка ў вёсцы. Мэта добрая і своечасная. Але, як відаць, аднэй добрай мэты мала. Як яна дасягаецца, у гэтым пытаньне. Няхай-жа расказвае сам аўтар Д. Хайтун. Вось першая старонка кнігі і на ёй буйным: **«Мэтадычныя заўвагі. Асноўныя задачы сьвяткаваньня».**

«Нашы сьвяты—гэта дзі, калі асабліва важнае для краіны гістарычнае здарэньне, або сучаснае пытаньне тлумачыцца шырокім колам працоўных мас. Гэтыя дні падагульваюцца нашы дасягненьні і вызначаюцца чарговыя задачы сацыялістычнага будаўніцтва. Кастрычнік—самае вялікае сьвята, бо ў Кастрычніку ўсе нашы дасягненьні на ўсіх галінах зьяцьця працоўных за ўвесь час рэвалюцыі».

Вось вам «сутнасьць» сьвята Кастрычніка. Мы напросім у нашага чытача на хвілінку зноў вярнуцца к часам падрыхтоўкі сьвяткаваньня. Напэўна ён заходзіў тады ў нашы кнігарні і пытаўся: «Ці няма ў вас чаго-небудзь пра Кастрычніка—брашур, п'ёс, інсцэнізак?».

— Ведаеце, а нічаўткі. Вось хіба любны зборнічак 1923 году. Можа сёе-тое знойдзеце.

Калі адбываліся такія дыялёгі ў кнігарнях, мы, дзівакі, ня ведалі, што ў нас самы час БДВ сьпішалася з вёскам патрэбнай нам кніжкі. Праўда, каторыя кажуць, што, ня гледзячы на спешку, гэта кніжка вышла, як і трэба было чакаць за 2-3 дні да сьвята. Нядзелі-то-ж, ня вышла да 12-ай гадавіны, то патрэбіцца ў 13-ую. Мы-ж ня зьбіраемся, бач, намірацъ.

І так, Кастрычніцкі падарунак Белдзяржвыдавецтва вышаў нуўдалым. Назва гэтага падарунку наступная. **«Кастрычнік у хаце-чытальні»**, аўтар **Д. Хайтун.** Старонак 156. Цана 60 к. Тираж 10.000.

Перш, чым прыступіць да разбору пасьцяй друкаванага падарунку, мы-б хацелі нашаму чытачу прыпомніць асноўныя лёзунгі ЦК партыі да Кастрычніцкай гадавіны—гэта яму патрэбна будзе далей.

Дык вось Д. Хайтун (як аўтар, ён нам вядомы) сваім зборнікам хацеў прыйсьці на дапамогу нашаму хатнику і даць яму мэтадычных і мастацка-літаратурных матар'ял па афармленьні сьвяткаваньня Кастрычніка ў вёсцы. Мэта добрая і своечасная. Але, як відаць, аднэй добрай мэты мала. Як яна дасягаецца, у гэтым пытаньне. Няхай-жа расказвае сам аўтар Д. Хайтун. Вось першая старонка кнігі і на ёй буйным: **«Мэтадычныя заўвагі. Асноўныя задачы сьвяткаваньня».**

«Нашы сьвяты—гэта дзі, калі асабліва важнае для краіны гістарычнае здарэньне, або сучаснае пытаньне тлумачыцца шырокім колам працоўных мас. Гэтыя дні падагульваюцца нашы дасягненьні і вызначаюцца чарговыя задачы сацыялістычнага будаўніцтва. Кастрычнік—самае вялікае сьвята, бо ў Кастрычніку ўсе нашы дасягненьні на ўсіх галінах зьяцьця працоўных за ўвесь час рэвалюцыі».

Вось вам «сутнасьць» сьвята Кастрычніка. Мы напросім у нашага чытача на хвілінку зноў вярнуцца к часам падрыхтоўкі сьвяткаваньня. Напэўна ён заходзіў тады ў нашы кнігарні і пытаўся: «Ці няма ў вас чаго-небудзь пра Кастрычніка—брашур, п'ёс, інсцэнізак?».

— Ведаеце, а нічаўткі. Вось хіба любны зборнічак 1923 году. Можа сёе-тое знойдзеце.

Калі адбываліся такія дыялёгі ў кнігарнях, мы, дзівакі, ня ведалі, што ў нас самы час БДВ сьпішалася з вёскам патрэбнай нам кніжкі. Праўда, каторыя кажуць, што, ня гледзячы на спешку, гэта кніжка вышла, як і трэба было чакаць за 2-3 дні да сьвята. Нядзелі-то-ж, ня вышла да 12-ай гадавіны, то патрэбіцца ў 13-ую. Мы-ж ня зьбіраемся, бач, намірацъ.

І так, Кастрычніцкі падарунак Белдзяржвыдавецтва вышаў нуўдалым. Назва гэтага падарунку наступная. **«Кастрычнік у хаце-чытальні»**, аўтар **Д. Хайтун.** Старонак 156. Цана 60 к. Тираж 10.000.

Перш, чым прыступіць да разбору пасьцяй друкаванага падарунку, мы-б хацелі нашаму чытачу прыпомніць асноўныя лёзунгі ЦК партыі да Кастрычніцкай гадавіны—гэта яму патрэбна будзе далей.

Дык вось Д. Хайтун (як аўтар, ён нам вядомы) сваім зборнікам хацеў прыйсьці на дапамогу нашаму хатнику і даць яму мэтадычных і мастацка-літаратурных матар'ял па афармленьні сьвяткаваньня Кастрычніка ў вёсцы. Мэта добрая і своечасная. Але, як відаць, аднэй добрай мэты мала. Як яна дасягаецца, у гэтым пытаньне. Няхай-жа расказвае сам аўтар Д. Хайтун. Вось першая старонка кнігі і на ёй буйным: **«Мэтадычныя заўвагі. Асноўныя задачы сьвяткаваньня».**

«Нашы сьвяты—гэта дзі, калі асабліва важнае для краіны гістарычнае здарэньне, або сучаснае пытаньне тлумачыцца шырокім колам працоўных мас. Гэтыя дні падагульваюцца нашы дасягненьні і вызначаюцца чарговыя задачы сацыялістычнага будаўніцтва. Кастрычнік—самае вялікае сьвята, бо ў Кастрычніку ўсе нашы дасягненьні на ўсіх галінах зьяцьця працоўных за ўвесь час рэвалюцыі».

Вось вам «сутнасьць» сьвята Кастрычніка. Мы напросім у нашага чытача на хвілінку зноў вярнуцца к часам падрыхтоўкі сьвяткаваньня. Напэўна ён заходзіў тады ў нашы кнігарні і пытаўся: «Ці няма ў вас чаго-небудзь пра Кастрыч

ПАЛЯПШАЮЧЫ ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ І АБСЛУГОЎВАНЬНЕ СПАЖЫЎЦА, УЗЬНІМЕМ РЭАЛЬНУЮ ЗАРПЛАТУ

ЦК САЮЗУ ШВЭЙНІКАЎ ПРАПАНУЕ:

АРГАНІЗАВАЦЬ МАСАВЫ КАНТРОЛЬ ЗА ЯКАСЬЦЮ ПРАДУКЦЫІ, УДАРНЫЯ БРЫГАДЫ ШВЭЙНІКАЎ І РАБОТНІКАЎ ПРЫЛАЎКУ ДЛЯ КАНТРОЛЮ ПРАВІЛЬНАСЬЦІ АЦЭНАК І ЗБЫТУ ПРАДУКЦЫІ, А ТАКСАМА ПАЧЫНАЧНЫЯ І ПЕРАРОБЧЫЯ МАЙСТЭРНІ

ДРУГІЯ САЮЗЫ ПАВІННЫ ПАСЬЛЕДАВАЦЬ ПРЫКЛАДУ ШВЭЙНІКАЎ

Аднэй з галоўнейшых задач прафсаюзаў зараз зьяўляецца барацьба за рэальнае павышэньне заработнае платы. Асноўныя шляхі, па якіх павінна ісьці рэальнае павялічэньне зарплаты,—гэта зьніжэньне цэн і паляпшэньне якасьці прадукцыі.

Аб вельмі цікавым пачынаньні ў гэтым напрамку, якое ўзьняў ЦК саюзу швэйнікаў, паведаміў нашаму супрацоўніку член ЦК саюзу тав. Гурвіч, які прыбыў у Менск.

Дрэнная якасьць прадукцыі,—кажа ён,— у першую чаргу адбіваецца на рэальнай зарплаце рабочага. Так, напрыклад, калі якасьць прадукцыі швэйнай прамысловасьці дрэнная, тэрмін носкі гэтай прадукцыі меншы, і ясна, што гэта паніжае зарплату рабочага. Зразумела, што якасьць прадукцыі залежыць ня толькі ад рабочых швэйнікаў; але і ад рабочых тэкстыльных фабрык, якія даюць сырэц швэйным фабрыкам.

ЦК саюзу швэйнікаў зараз высунуў пытаньне аб неабходнасьці **масавага кантролю за якасьцю прадукцыі.** Трэба дабіцца таго, каб уся група рабочых, якая выробляе тую ці іншую прадукцыю, **цалкам адказвала за якасьць выпусканай прадукцыі.**

Да гэтага часу падлік браку быў пастаўлены вельмі дрэнна. Ня было ніякага крытэрыя для ацэнкі браку.

Трэба ўвесьці мэтады ўзаемнага кантролю аднаго цэху над другім, фабрыкі над фабрыкай і аднаго рабочага над другім рабочым. Ва што-б там ні стала трэба дабіцца грамадзкай увагі да гэтага пытаньня.

Лепшыя рабочыя і цэхі павінны быць прэміяваны за лепшую выпрацоўку і зьмяншэньне браку. У культработу трэба ўвесьці **элемэнты прапаганды** за паляпшэньне якасьці і зьмяншэньне браку.

Для павялічэньня рэальнай зарплаты рабочага па швэйнай прамысловасьці канкрэтна павінна быць зроблена наступнае:

Да гэтага часу зусім не вывучалася пытаньне асартымэнту тавараў. Ёсьць выпадкі, **калі рабочаму патрэбен адзін** разьмер гатовага адзеньня, а ён атрымлівае другі, непатрэбны яму. Акрамя таго, што больш разьмер патрабуе больш матар'ялаў і абыходзіцца даражэй фабрыцы, рабочаму прыходзіцца яшчэ ісьці да прыватнага краўца і заплаціць грошы за перашыўку гарнітуру або паліта. Зразумела, што пытаньне асартымэнту вельмі важнае. Правільны асартымэнт таксама ўплывае на рэальнае павялічэньне зарплаты.

Магазыны гатовага адзеньня ні ў якім выпадку не павінны выдаваць пакупцом тавары, якія ім не падыходзяць. Пры ўсіх магазынах трэба арганізаваць **перароблыя майстэрні.** Гэта патаніць перароблу гатовага адзеньня ня менш, **чым на 80 проц.**

У некаторых мясцох, пакуль прадукцыя швэйных фабрык даходзіць да спажыўца, **кошт яе павялічваецца ня менш, чым на 40 проц. Гэтае зьявішча зусім недапушчальнае, каапэрацыйныя арганізацыі павінны прыкласьці ўсе сілы, каб дабіцца зьніжэньня накладных выдаткаў.**

Для барацьбы з нацэнкамі на прадукцыю павінны быць арганізаваны **ўдарныя брыгады з рабочых швэйнікаў і работнікаў прылаўку, якія павінны кантраляваць правільнасьць нацэнак і збыту праднукцыі.**

Побач з гэтым, высоўваецца пытаньне аб рэгуляваньні продажу гатовага адзеньня. Вельмі часта рабочы ня можа дастаць паліто, або гарнітур таму, што пакуль ён зьбярэцца, спэкулянт або гандляр гэтае паліто купляе. Мы лічым неабходным урэгуляваць продаж гатовага адзеньня шляхам адзнакі аб куплі паліта або гарнітуру ў заборнай кніжцы ці іншым шляхам.

Падладжваньне адзеньня ў саматужніка або прыватніка рабочым амаль што немагчыма з-за дарагіх цэн, якія там існуюць. Мы высоўваем пытаньне аб **арганізацыі сеткі майстэрань з беспрацоўных краўцоў.** Гэтае мерапрыемства таксама значна дапаможа рэальнаму павялічэньню зарплаты рабочага.

На мясцох павінен быць шырока ўжыты **мэтад скліканьня нарад рабочых сумесна з работнікамі прылаўку** для вырашэньня мерапрыемстваў, зьвязаных з паляпшэньнем якасьці прадукцыі швэйнай прамысловасьці і асартымэнту.

Прафэсыянальныя арганізацыі на мясцох павінны прыкласьці ўсе сілы і зьвярнуць на гэта пытаньне асаблівую ўвагу.

ЦК саюзу швэйнікаў на працягу бліжэйшых 3-х месяцаў скліча цэлы рад нарад, прысьвечаных пытаньню рэальнага павышэньня зарплаты рабочага.

А—с.

Абслугоўваньне спажыўца ўсё яшчэ нездавальняючае

Мабілізуем рабочую грамадзкасьць вакол баявых задач каапэрацыі

Цэнтрасаюз яшчэ некалькі месяцаў таму назад даў канкрэтныя практычныя дырэктывы аб барацьбе з чаргамі, паляпшэньні тэхнікі гандлю і павышэньні якасьці абслугоўваньня спажыўца. Белкаапсаюз і Белрабсэкцыя са свайго боку ўстанавілі цьвёрдыя тэрміны ажыцьцяўленьня гэтых мерапрыемстваў для гарадзкой сеткі да 1-га сьнежня і сельскай—да 1-га студзеня.

Аднак, справа паляпшэньня абслугоўваньня спажыўца ва многіх раёнах Беларусі яшчэ дагэтуль ня зрушана з месца.

Побач з некаторымі аб'ектыўнымі прычынамі (некаторы недахват асноўных тавараў, дрэнная абсталяваньне памяшканьняў, адсутнасьць належнай колькасьці кваліфікаваных працаўнікоў), дрэннае абслугоўваньне спажыўца зьяўляецца вынікам маруднага тэмпу ажыцьцяўленьня дырэктыў Цэнтрасаюзу.

Яшчэ дагэтуль наглядаецца некаторая інэртнасьць працаўнікоў прылаўку да пераводу работы на новыя формы. Прафэсыянальныя арганізацыі зрабілі пакуль што вельмі мала для растлумачэньня працаўнікам гандлёвага апарату важнасьці гэтых мерапрыемстваў.

Усё гэта пацьвердзілася пры папярэдняй праверцы інструктарамі Цэнтрасаюзу і Белкаапсаюзу ў акругах Беларусі.

Віцебскі райсаюз абмежаваўся фармальнай рассылкай па нізоўцы абежніку, але не праверыў, як ажыцьцяўляецца яго дырэктыва.

У апошні час, як быццам, намячаецца некаторы зрух. Адкрыта 10 новых магазынаў, 16 гандлёвых адзінак перайшло на бесьперапынку, 6 спажывецкіх таварыстваў зьмянілі часы гандлю з мэтай набліжэньня да запатрабаваньняў спажыўцоў. У крамах 10-ці спажывецкіх таварыстваў уведзена папярэдняе разважваньне тавараў. Штат працаўнікоў крам павялічаны з 402 да 446. На аднаго працаўніка прылаўку прыходзіцца 1.134 жыхары замест ранейшых 1.258.

Дняпрасаюз адкрывае па Аршанскай і Магілеўскай акругах 80 новых крам і 25 ларкоў. Арганізуецца развозны гандаль. На бесьперапынку пераводзіцца 15-20 проц. усёй крамнай сеткі. У выніку гэтых мерапрыемстваў колькасьць двароў на адну каапэрацыйную краму зьніжаецца з 360 да 300.

Горш абстаіць справа ў Полацкай акрузе. Там да гэтага часу ў адносінах паляпшэньня абслугоўваньня спажыўца нічога ня зроблена. Работа ўсё яшчэ ідзе пастарому.

Што робіць рабочая каапэрацыя для паляпшэньня абслугоўваньня спажыўца? Матар'ялы па 12-ці ЦРК гаворыць аб тым, што тут становішча лепшае.

На 1-га жніўня па гэтых ЦРК налічвалася 680 гандлёвых адзінак, у лістападзе—727, а на 1-га сьнежня сетка крам папырэдняе разважваньне тавараў. Штат працаўнікоў крам павялічаны з 402 да 446. На аднаго працаўніка прылаўку прыходзіцца 1.134 жыхары замест ранейшых 1.258.

У Віцебску праведзен першы вопыт развозкі тавараў на дом. Вопыт даў добрыя вынікі. Пачынаюць ужывацца папярэднія заказы на тавары. Для перадпрыхтоўкі працаўнікоў у Магілеве, Віцебску і інш. гарадох арганізаваны курсы.

Але, калі колькасныя паказальнікі па ўсіх ЦРК Беларусі больш-менш здавальняючыя, дык у адносінах якасьці работы становішча далёка яшчэ ляспрыяючае. **Чаргі яшчэ дагэтуль ня зьнішчаны. Гандлёвыя памяшканьні не прыстасаваны да работы. У Віцебску пераабсталявана ўсяго некалькі магазынаў, а ў Полацку пабудаваны толькі адзін новы магазын.** Не ўрэгуляваны час дастаўкі прадуктаў у крамы. Ва многіх ЦРК **зусім не зварачаюць увагі на трыманьне магазынаў у чыстаце.**

Папярэдняе абсьледваньне рацыяналізатарскага мінімуму па каапэрацыі ў Беларусі паказала, што ў гэтай галіне патрэбен рашучы пералом. Да барацьбы за лепшае абслугоўваньне спажыўца павінна быць прыцягнута ўся каапэрацыйная грамадзкасьць.

М. .К

Падрыхтоўчая праца да перавыбараў рэдкалегій

у большасьці раёнаў сваячасова не праведзена

Нядбайныя адносіны да справаздачна-перавыбарчай кампаніі—ёсьць простае невыкананьне дырэктыў ЦК КП(б)Б. Нізавым партыйным арганізацыям трэба зрабіць рашучы пералом у сваіх адносінах да рабселькораўскага руху. Справаздачна-перавыбарчая кампанія працягнута да 15-га сьнежня. Трэба нагнаць страчаны час і з посьпехам правесьці кампанію

Аб чым гаварылі на нарадзе

Пры рэдакцыі газэты **«Зьвязда»** 10-га лістапада адбылася нарада загадчыкаў масавых аддзелаў акруговых і цэнтральных газэт па пытаньні аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі рэдкалегій.

Па інфармацыі **тав. Вержбаповіча** («Зьвязда») аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі выказаўся цэлы рад таварышоў. З інфармацыі і спрачак выявілася, што падрыхтоўчая работа да справаздачна-перавыбарчай кампаніі рэдкалегій насьценных і друкаваных газэт у большасьці раёнаў у тэрмін, вызначаны ЦК КП(б)Б, не праведзена. Некаторыя акруговыя і цэнтральныя газэты недаацанілі гэтай важнай палітычнай кампаніі, а раённыя камітэты партыі і ячэйкі ў большасьці сваёй казённа падыйшлі да гэтае справы і змазваюць яе палітычнае значэньне.

Лепш за ўсё стаіць справа з падрыхтоўкай да перавыбарчай кампаніі ў Гомельшчыне і Меншчыне. Рэдакцыя газэты «Полесская Правда» сваячасова разгарнула работу, **выпучыла брыгаду з 60 чалавек** для абсьледваньня насьценгазэт. У Менску Кастрычніцкі райком КП(б)Б яшчэ ў кастрычніку месяцы вылучыў камісіі для спэцыяльнага абсьледваньня работы насьценных газэт 10 буйных прадпрыемстваў. Фрунзаўскі райком КП(б)Б прымацаваў да ўсіх насьценгазэт прадстаўнікоў райкомаў, якія адказваюць перад райкомам за сваячасовае і якаснае праведзеньне перавыбараў рэдкалегій насьценгазэт.

У апошні час, хаця і з вялікім спазьненьнем, газэта **«Віцебскі Пралетары»** зьвярнула на справаздачна-перавыбарчую кампанію належную ўвагу і таксама павяла работу ўзмоцненым тэмпам. У часе падрыхтоўчай работы рэдакцыі акруговых і цэнтральных газэт зрабілі звыш 20-ці выездаў у раёны спэцыяльна для праведзеньня нарад селькораў і членаў рэдкалегій. Лепш за ўсё ў гэтай галіне правялі работу газэты **«Беларуская Вёска»** і **«Камуніст»** (Бабруйск).

На нарадзе выявілася, што з боку большасьці нізавых партыйных і прафэсыянальных арганізацый наглядаюцца пасыўныя адносіны да справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Райкомы партыі і ячэйкі не надаюць гэтай кампаніі палітычнага значэньня. Так, **Ветрынскі** райком партыі гэту кампанію «адкладаў», а гарадзкі райком партыі (Магілёў) прасіў таксама аб адтэрмінаваньні.

Працаўнікі **Тураўскага** райкому партыі адказалі, што **яны новыя людзі і нічога аб перавыбарах ня ведаюць.** У некаторыя райкомы (**Коханаўскі, Тураўскі**) выяжджалі прадстаўнікі «Бел. Вёскі» па з разы, але райкомы падрыхтоўчай работы для скліканьня сходаў селькораў не правялі.

Рэдакцыя «Полесской Правды» склікала **у Рэчыцы і Добрушы** сход рабселькораў. Прасілі прадстаўнікоў райкому зайсьці на сход, але апошнія адказалі: «Возможно на собрание зайдем». Вось вам адносіны працаўнікоў райкому да такой важнай кампаніі, як перавыбары рэдкалегій.

Акрамя гэтага пытаньня, нарада абгаварыла цэлы рад іншых пытаньняў, якія цесна зьвязаны з работай рэдкалегій насьценгазэт, з арганізацыяй новых газэт у калгасах, саўгасах і г. д.

Нарада па інфармацыі т. Вержбаловіча аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі прыняла рэзалюцыю з канкрэтнымі прапановамі.

У. Б.

Рэзалюцыя нарады аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі рэдкалегій насьценгазэт

Заслухаўшы інфармацыю т. Вержбаловіча аб падрыхтоўцы і ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі па акругах, нарада загадчыкаў масавых аддзелаў газэт адзначае наступнае:

1. У большасьці вясковых і гарадзкіх раёнаў падрыхтоўчая праца ў тэрмін, вызначаны ЦК КП(б)Б у пляне праведзеньня кампаніі — **не праведзена,** з прычыны нядбайных адносін з боку партыйных ячэек і РК КП(б)Б і невыстарчальнай увагі з боку газэт.

2. Ёсьць цэлы рад раёнаў (Лёзьнянскі, Тураўскі, Веткінскі, Брагінскі, Талачынскі, Коханаўскі, Лоеўскі, Каралішчанскі і інш.), дзе і да гэтага часу ніякай падрыхтоўчай работы не праведзена.

3. Перавыбары рэдкалегій як у гарадзкіх, так і вясковых раёнах, за выключэньнем асобных выпадкаў, яшчэ не распачаліся.

4. Асьвятленьне ходу падрыхтоўчай і справаздачна-перавыбарчай кампаніі ў цэлым радзе газэт невыстарчальнае, асабліва ў газэтах **«Беларуская Вёска», «Рабочий», «Камунэр Магілеўшчыны», «Чырвоная Полаччына», «Камуніст».**

Нарада лічыць патрэбным, каб забясьпечыць пасьпяховае праведзеньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі, ужыць наступныя мерапрыемствы:

а) Зараз-жа праверыць выкананьне РК КП(б)Б і ячэйкамі дырэктыў ЦК КП(б)Б аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Аб тых РК і ячэйках, якія нядбайна адносяцца да пасьпяховага праведзеньня гэтай кампаніі, зьмясьціць адпаведны матар'ял у газэтах і паставіць аб іх пытаньне перад АК КП(б)Б.

б) Там, дзе не праведзены нарады рэдкалегій і рабселькораў па пытаньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі—правесьці іх сумесна з РК КП(б)Б у бліжэйшыя дні.

в) Паставіць пытаньне перад усімі РК КП(б)Б аб прымацаваньні неадкладна да кожнай насьценгазэты прадстаўніка РК, які павінен дапамагчы і адказваць за сваячасовае праведзеньне перавыбараў рэдкалегій.

г) Акруговым газэтам сіламі супрацоўнікаў рэдакцыі і рабкораў зрабіць «налёт» па асобныя рэдкалегіі з мэтаю праверкі праведзеньня падрыхтоўчай работы да перавыбараў. Вынікі даць у газэту.

д) У газэтах больш шырока асьвятляць перавыбарчыя сходы і працу асобных газэт, асабліва ў галіне масавай работы. Больш зьмяшчаць рэцэнзій і артыкулаў кіруючага характару.

е) У часе перавыбараў зьвярнуць увагу на арганізацыю пры насьценгазэтах бюро дасягненьняў. Выбары бюро дасягненьняў лічыць нямэтазгоднымі, таму, што гэта супярэчыць пастановам IV усесаюзнай нарады.

ж) Завастрыць увагу на старонках газэт і прасачыць за тым, каб на справаздачна-перавыбарчых сходах рабіліся судаклады адміністрацыі аб рэагаваньні і выкананьні прапаноў па рабселькораўскіх заметках.

з) На прадпрыемствах, дзе ўведзены бесьперапынны тыдзень, справаздачу і перавыбары рэдкалегій зрабіць у адзін дзень за два прыёмы (удзень і ўвечары).

к) Зьвярнуць **асаблівую** ўвагу на падбор складу рэдкалегій друкаваных фабзаводзкіх газэт.

л) У часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі ў акруговых газэтах завесьці падлік усіх насьценгазэт па акрузе.

м) Рэдакцыям газэт на час перавыбарчай кампаніі арганізаваць пры рэдакцыях або АПА габінэтах кансультацыі.

Згодна пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 15-XI г. г. тэрмін справаздачна-перавыбарчай кампаніі рэдкалегій насьценных і друкаваных (фабзаводзкіх) газэт працягнут да 15 сьнежня 1929 году.

Насьценгазэты ў заняпадзе

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Да гэтага часу ніякай падрыхтоўчай работы да перавыбараў рэдкалегій **Коханаўскі** райком партыі не праводзіў, ня гледзячы на дырэктывы Аршанскага АК КП(б)Б. Працаўнікі райкому ня маюць уяўленьня, як трэба праводзіць перавыбарчую кампанію рэдкалегій насьценгазэт. Зьмешчаныя матр'ялы ў газэце «Зьвязда» ня толькі не скарыстоўваюцца, але нават і ня чытаюцца.

Насьценны друк у Коханаўскім раёне ў поўным заняпадзе. У райкоме няма ўліку ліку газэт, якія выдаюцца на тэрыторыі раёну.

На сходзе партарганізацыі многія таварышы, якія выступалі ў спрэчках, расказвалі аб момантах праследваньня селькораў з боку старшыні РВК **Сьліванкова,** за выкрыцьцё недахопаў у рабоце РВК. Выступіўшы Сьліванкоў сказаў: «Я ніколі нікога не праследваў, таму, што я нават насьценгазэт ніколі ня чытаю». Ня толькі Сьліванкоў, але ніхто з раённых кіраўнікоў насьценгазэт ня чытае і на зьмешчаныя заметкі не рэагуе.

Т. **Сазонаў,** які ў камсамольскай насьценгазэце выкрыў рад злоўжываньняў, зробленых Сьліванковым, праследуўся і цкаваўся. У выніку таго, што на зьмешчаныя заметкі ў насьценгазэтах ніхто з раённых і сельсавецкіх органаў і арганізацый не рэагаваў, многія газэты зусім разваліліся—рабселькоры кінулі пісаць, бачачы, што насьценгазэты ператварыліся ў звычайныя кавалкі паперы. Ні райкомам, ні партыйнымі ячэйкамі ніякай работы з рабселькорамі не вядзецца. На скліканую намі і райкомам нараду ні адзін селькор не зьявіўся.

Уль. Эль.

Райком ня цікавіцца селькорамі

(Самахвалаўскі раён, Меншчына)

У свой час у газэце «Зьвязда» шмат пісалася аб тым, што ў Самахвалаўскім раёне ніякай работы з рабселькораўскім актывам не вядзецца. У гэтым раёне былі забойствы селькораў Іванавіча, Фалько і іншых.

Здавалася пасьля ўсяго гэтага Самахвалавіцкаму РК КП(б)Б і ЛКСМБ трэба было ўзяцца за работу з рабселькорамі. Але ў Самахвалавічах мы гэтага ня бачым. Уж больш за год аб ня было нарады рабселькораў. Праводзяцца розныя палітычныя кампаніі. Райкому КП(б)Б трэба было мабілізаваць увесь рабселькораўскі актыў на дапамогу правядзеньню гэтых кампаній. Але райком нічога не зрабіў.

Што адкажа на гэта райком КП(б)Б?

Рабселькоры з нецярплівасьцю чакаюць сваёй нарады. **Селькор А. Г.**

Пачаліся перавыбары

У Расьнянскім раёне праведзена падрыхтоўчая праца да перавыбараў рэдкалегій. Адбылася нарада селькораў, членаў рэдкалегій і парт'ячэек. Вылучаны прадстаўнікі райкомаў для ўдзелу ў правядзеньні перавыбараў. Зараз праводзіцца праверка ходу работы на мясцох. Ужо перавыбраны дзьве рэдкалегіі насьценгазэт.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

ПА ТЭЛЕГРАФУ, ТЭЛЕФОНУ І ПОШТАЙ АД НАШЫХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ

Пабудова мэханізаванага элеватара

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Саюзхлеб прыступае да пабудовы мэханізаванага элеватара на беразе ракі Сож каля дрэваапрацоўчага камбінату. Элеватар будзе непасрэдна выгружаць хлеб з баржаў, а таксама са складаў чыгункі. Для гэтай мэты да самага элеватара будзе праведзена чыгуначная ветка. Ёмістасьць элеватара разьлічана на 1 мільён пудоў збожжа з паступовым пашырэньнем да 1½ мільёнаў.

За дрэннае кіраўніцтва—вымова

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Скончыў сваю працу пашыраны пленум Гомельскага вучпрафсожу, на якім абгаворвалася цытаньне аб рэнным кіраўніцтве работаю прэзыдыуму вучпрафсожу. Прэзыдыум вучпрафсожу слаба кіраваў сацыялістычным спаборніцтвам. Рабочыя брыгады но працавалі. Пленум вынес вымову ўсяму прэзыдыуму вучпрафсожу, а таксама вьняў з працы старшыню Гомельскага вучпрафсожу тав. **Гараб'ёва.** За старшыню прэзыдыуму вучпрафсожу выбраны тав. МІХАЙЛАЎ.

Справа кулакоў--контр-рэвалюцыянэраў

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). У часе правядзеньня спробнай мабілізацыі кулакі стараліся выкарыстаць гэты момант, каб запалохаць сялянства і для контр-рэвалюцыйнай агітацыі. Так, напрыклад, калі была абвешчана спробная мабілізацыя ў Кармянскім раёне, кулак в. Баравая Бура, які мае свой уласны млын, пачаў агітаваць прызыўнікоў, што гэта ня спробная, а сапраўдная мабілізацыя, што зараз ужо ідзе вайна, што на ст. Рагачоў стаяць эшалёны з параненымі чырвонаармейцамі і інш.

Такую-ж самую шкодніцкую прапаганду і хлусьню вёў у часе спробнай мабілізацыі ў Клімавіцкім раёне былы буйны памешчык Глазоўскі Васіль. Ён згуртаваў вакол сябе кулакоў і падкулачнікаў і вёў сярод сялянства агітацыю супроць самаабкладаньня, калектывізацыі і г. д.

Надзвычайная сэсія Вярхоўнага суду прыгаварыла Вараб'ёва і Глазоўскага на 3 гады зьняволеньня кожнага. Акрамя таго, Глазуноў пазбаўлены судом грамадзянскіх праў на 5 год і яму забаронена жыць у межах БССР пасьля адбыцьця пакараньня на той-жа тэрмін.

С.-г. камуна перайшла на грамадзкае харчаваньне

ВОРША. (Наш кар.). Кастрычніцкія ўрачыстасьці зьявіліся для сельска-гаспадарчай камуны імя 10-цігодзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі далейшым этапам у справе пераходу да новых форм сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта камуна скончыла пабудову сталоўкі і кухні. 7-га лістапада камуна перайшла на грамадзкае харчаваньне. На ўрачыстым адчыненьні сталоўкі прысутнічалі сяляне вакольных вёсак, саўгасаў і калгасаў. Сельска-гаспадарчая камуна імя 10-цігодзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі зьяўляецца, такім чынам, першаю калектыўнай гаспадаркай на Аршаншчыне, якая перайшла на грамадзкае харчаваньне.

Пад суд за сувязь з прыватнікам

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Праўленьне Журавіцкага і Кармянскага спажыв. і с.-г. таварыстваў (Магілеўшчына) дапускалі на рынак ў м. Карме і Журавічах для скупкі жывёлы прыватнікаў і забясьпечвалі іх патрэбнымі авансамі.

Уся гэта шкодніцкая работа дэзарганізоўвала рынак.

Зараз справа аб сувязі работнікаў гэтых каапэратываў з прыватнікам перадана ў РСІ для прыцягненьня вінаватых да судовай адказнасьці.

С.-г. выстаўка ў саўгасе Лошыца

САМАХВАЛАВІЧЫ. (Наш селькор). Закрылася сельска - гаспадарчая выстаўка, арганізаваная ў саўгасе Лошыца, Самахвалавіцкага раёну. Усяго на выстаўку былі дастаўлены 923 экспанаты. Прэміяваліся толькі бядняцкія і серадняцкія гаспадаркі. Усяго за лепшыя экспанаты атрымалі прэміі 33 гаспадаркі.

ТРЫВОЖНЫЯ СЫГНАЛЫ

(Да пытаньня аб перабудове культурна-масавай работы ва ўмовах рэканструкцыйнага пэрыяду)

Перажываны пэрыяд вялізарнай сацыялістычнай перабудовы ўсёй гаспадаркі востра высоўвае перад намі праблему культурнай работы. Пэрыяд рэканструкцыі ў галіне гаспадаркі пановаму ставіць пытаньні культурнага абслугоўваньня рабочых і сялянскіх мас, пытаньні **арганізацыі быту** працоўных. Цяпер, калі ўвядзеньне песьперапыннага тыдню самае рэшткі старых звычак і старога быту, калі шалёны тэмп індустрыялізацыі і калектывізацыі востра выпукляе ўсю важнасьць павышэньня культурнага ўзроўню мас, калі адначасова пытаньні мас растуць у нас на вачох, ня могуць быць захаваны старыя формы і мэтады масавай культурнай работы, нельга, як раней, весьці гэту важнейшую з важнейшых спраў. Праблемы поўнай перабудовы масавай культурнай работы, перабудовы дзейнасьці нашых прафсаюзных культаддзелаў, стаяць зараз, як надзейныя, **падвойна палітычныя** праблемы дня, вырашэньнем якіх павінна заняцца ўся партыя, прафсаюзы і савецкія органы асьветы.

А па гэтым фронце нашай работы вельмі нядобра. І «Правда» зусім правільна ў сваім рэдакцыйным артыкуле ад 11-га лістапада «Аб масавай мастацкай рабоце» падкрэсьлівае, што задача «аб ударным разгортваньні культработы»... «паўстае перад намі, як неадкладная практычная задача»...

З сыстэму культработы сярод рабочых і сялянскіх мас уваходзяць надзвычай розпастайныя формы і мэтады ўзьдзейваньня на гэтыя масы, арганізацыі мас, пачынаючы ад кіно, бібліятэк, выдавецтваў і канчаючы клюбамі, хатамі-чытальнямі, чырвонымі куткамі і радыё.

Мы хочам у гэтым артыкуле спыніцца на адным з зьвеньняў гэтай сыстэмы, а іменна, на культурнай рабоце сярод пралетарскіх мас, па тым, у якой ступені нашы прафсаюзы, рабочыя клюбы і іншыя арганізацыі прыстасавалі сваю работу да новых патрабаваньняў рэканструкцыйнага пэрыяду.

Трэба проста сказаць, не заплюшчваючы вачэй на праўду, што гэта галіна работы перажывае і ў нас у БССР **сур'ёзны крызіс,** які выцякае з няўменьня перабудаваць усю культработу, прыстасаваць да новай абстаноўкі.

Адным з цэнтральных месц гэтага крызісу зьяўляецца перш за ўсё **масавая клюбная работа,** якая павінна быць адным з аснoўных стрыжняў культурнага абслугоўваньня рабочых мас і садзейнічаньня павышэньню іх культурнага ўзроўню. Калі і раней культработа прафсаюзу, клюбаў, чырвоных куткоў далёка не здавальняла пралетарскія масы, дык зараз, у пэрыяд пяцігодкі, 7-мігадзіннага рабочага дня, бесьперапынкі, у пэрыяд **абвастрэньня клясавай барацьбы ў краіне** яна зусім пляцецца ў хвасьце. У рабочай клясе мы маем такія зьявішчы, як, з аднаго боку, рост палітычнай актыўнасьці, павышэньне культурнага ўзроўню мас, і ў сувязі з гэтым рост запатрабаваньняў, а з другога боку—усьведамленьне яўнага недахвату культурнасьці, усьведамленьне вялізарнай адсталасьці перад тымі патрабаваньнямі, якія прад'яўляюцца да пралетара эпохай рэканструкцыі. Работа нашых клюбаў, уся культработа наогул павінна здавальняць гэтыя патрабаваньні мас і патрабаваньні ўсяго пэрыяду пераробкі і перабудовы нашага жыцьця. На справе-ж мы маем адсталасьць культработы ад падзей, што хутка разьвіваюцца, яе закасьцянеласьць, а часамі і простае засільле апартунізму ў гэтай справе, які паводле трапнага выразу «Правды» «мяртвіць усе жывыя пачынаньні» ў галіне культработы і «зводзіць яе да культур'егерства».

Возьмем для прыкладу невялікі, але вельмі характарны факт. Мінулая гадавіна Кастрычніка з нязвычайнай выразнасьцю паказала, на якой нізкай ступені знаходзіцца ў нас у БССР работа рабочых клюбаў і культурнае абслугоўваньне рабочых. Гадавіна, юбілей, рэвалюцыйнае сьвята, здавалася-б, павінны былі выявіць усе дасягненьні і ў галіне культурнай работы. Нашы клюбы, здавалася-б, павінны былі паказаць першыя парасткі перабудаванай на новых пачатках работы. А што-ж мы бачылі на справе? Адсутнасьць удзелу саміх рабочых у клюбнай рабоце, у вогуле даволі нізкі ўзровень зьместу вечароў, ва многіх мясцох простая халтуршчына, якая ўжо не здавольвае рабочых. Нават вечар, які быў даны пасьля ўрачыстага пасяджэньня гарсавету і які павінен быў зьявіцца паказальнікам пэўных дасягненьняў за год у культурнай галіне, у большым маштабе, чым адзін клюб, нават і гэты вечар паказаў з усёй выразнасьцю паяўнасьць ў нас сваясаблівых культурных «ножніц». «Ножніцы» гэтыя выяўляюцца ў вялізных разыходзінах паміж тым, што **мы даем** рабочаму і што вырасшы рабочы **патрабуе ад нас.** А калі ўзяць усю штодзённую, не сьвяточную работу клюбаў і іншых культурных устаноў, дык тут мы павінны канстатаваць яшчэ большую адсталасьць, яшчэ большы, сказалі-б мы, кансэрватызм.

Нам давялося гаварыць якраз у сувязі з Кастрычніцкімі вечарамі з радам пралетараў Менску, якія вельмі востра ставяць усе гэтыя пытаньні». Рабочы не знаходзіць у клюбе патрэбнага; яго не здавальняе халтуршчына; рабочаму сумна ў клюбе; трэба ва ўсю шырыню паставіць пытаньне аб перабудове нашай клюбнай работы і ўсяго культурнага абслугоўваньня рабочых»—заяўляюць яны.

Пераход на бесьперапынны тыдзень яшчэ вастрэй ставіць усе гэтыя праблемы. Цэнтральная партыйная прэса ўжо сыгналізавала надзвычай трывожныя і небясьпечныя зьявішчы, якія выказваюцца ў тым, што пераход на бесьперапынку застаў зьнянацку нашых культурных работнікаў. Больш таго, ажыцьцёўлены пераход на бесьперапынку яшчэ не разварушыў культработнікаў. Яшчэ моцны бюракратычны дух у культурных арганізацыях, у канцылярыях клюбаў, у органах, якім трэба ведаць гэтай справай. Зусім ясна, што партыя ня можа пакінуць гэту справу ў такім стане, у якім яна зараз знаходзіцца. Трэба з усёй сілай ударыць па нядбайнасьці, закасьцянеласьці і адсталасьці на культурным вучастку нашай работы.

Трэба з усёй вострасьцю паставіць перад культаддзеламі прафсаюзаў, клюбамі, грамадзкімі арганізацыямі задачы па зьнішчэньні крызісу, які перажывае культурная работа сярод пралетарскіх мас.

Трэба, зламаўшы сьцяну бюракратычнай пасыўнасьці, патрабаваць ад культурных арганізацый, ад органаў Наркамасьветы і рабочых клюбаў плянаў перабудовы ўсёй іх работы прыстасоўна да новых умоў рэканструкцыйнага пэрыяду.

Трэба прыкаваць увагу партыйных арганізацый і рабочай грамадзкасьці да работы ўсёй клюбнай сыстэмы, якая, як адзначае гэта «Правда», павінна стаць «настаянным моцным арганізацыйным касьцяком»... «нашай масавай мастацкай работы».

І ў гэтай галіне, як і ва ўсіх іншых, нам прыдзецца і прыходзіцца перамагаць супраціўленьне клясавага ворага, які ня сьпіць у справе сваясаблівай «культурнай» і «ідэалёгічнай» апрацоўкі працоўных. Нам трэба будзе перамагаць і апартуністычныя адносіны да поўнай перабудовы ўсёй нашай культурнай работы.

Мы павінны будзем правесьці **агляд работы** нашых клюбаў з пункту погляду таго, як яны перабудоўваюць сваю работу ў сувязі з новай абстаноўкай, з бесьперапынкай, з 7-мігадзінным рабочым днём і г. д. Мы павінны ўзяць пад абстрэл крытыкі інэртнасьці, пасыўнасьць і марудпасьць у гэтай справе.

Нам трэба патрабаваць, каб па старонках партыйнай і савецкай прэсы знайшлі месца пляны і меркаваньні ў галіне разгортваньня работы ўжо па даны надыходзячы пэрыяд зімовай работы. Трэба праверыць, як культработа нашых саюзаў, клюбаў і г. д. зьвязваецца з нацыянальнай палітыкай партыі (беларусізацыя, барацьба з шавінізмамі і нацыянал-дэмакратызмам, інтэрнацыянальнае выхаваньне мас).

Перад усімі партыйнымі, прафэсыянальнымі і савецкімі арганізацыямі мы ва ўсю шырыню ставім зусім насьпеўшае і вострае пытаньне **аб масавай культурна-мастацкай рабоце і яе перабудове, прыстасоўваючыся да абстаноўкі рэканструкцыйнага пэрыяду.**

Ад усіх гэтых арганізацый, ад усіх кіраўнікоў, што непасрэдна ведаюць гэтай справай, мы чакаем канкрэтных адказаў аб тым, што зроблена, што робіцца і што будзе рабіцца на культурным вучастку сацыялістычнай рэканструкцыі.

Ст. М.

Рэдакцыя лічыць, што Ст. М. у гэтым артыкуле ўзьнімае цэлы рад вельмі сур'ёзных і важных пытаньняў, якія сапраўды настойліва патрабуюць вырашэньня. Рэдакцыя зварачаецца да культурных работнікаў, асабліва, саюзных, з просьбай выказацца на старонках нашай газэты па гэтых пытаньнях і падзяліцца практыкай.

БАРЫСАЎЦЫ, ужываючы рад канкрэтных сапраўдных мерапрыемстваў па распаўсюдж

Папярэдзім адсеў рабочых ад школ

Сваячасова рэагаваць

На гэты год значна пашырана сетка вячэрніх школ. Адкрыты новыя школы ў Менску, Віцебску, Гомелі, Полацку і на ўсіх фабрычна-заводзкіх раёнах Беларусі.

Буйным струменем уліваецца рабочая моладзь і дарослыя ў школы (яны на 80 проц. укамплектаваны рабочымі).

У інспэктарытах палітасьветы—груды ад заяў нездаволеных—не хапае месц. Груда расьце, ня гледзячы на тое, што школы працуюць ужо 2 месяцы.

І ўсё-ж гэты яскравы паказ буйнога росту культурных запатрабаваньняў у асяродзішчы працоўных мас мае свой адваротны бок, ад якім сьведчыць факт штогадовага вялікага адсеву рабочых ад школ.

Ён пагражае нам і зараз. Ёсьць рад фактаў з Гомелю. «Полесская Правда» зьмяшчае артыкул пад загалоўкам: «Б'ем трывогу», у якім сыгналізуецца неахват школамі ўсіх малаграматных рабочых буйнейшых прадпрыемстваў, як фаб. «Вэзуві», «Дняпро», адсеў некаторых, якія дагэтуль вучыліся.

Чым-жа выклікаецца гэты адсеў і ці ёсьць магчымасьць унікнуць яго на бягучы год.

Да гэтага часу ў нас існавала сыстэма школ так званага павышанага тыпу, набудаванага на базе 7½—8-годкі і школ рабочай моладзі на базе 6-цігодкі. Апошні тым ця мог задаволіць рабочага не даючы магчымасьці лепшага пераходу пасля у сярэднюю навучальную ўстанову, тады як школы павышанага тыпу непасрэдна ўліваліся ў ВНУ.

Гэта першая і буйная прычына таго вялікага адсеву ад школ рабочай моладзі, які назіраўся кожны год. Апрача гэтага, шмат іншых прычын, як недастатковая падрыхтоўчая кампанія сярод рабочых па ўцягненьні іх у школу перад навучальным годам. Былі выпадкі з гомельскае практыкі, што рабочыя адсталых пластоў некаторых прадпрыемстваў, («Вэзуві») адмаўляліся пайсьці на вучобу. Прафсаюзы ў гэтых выпадках праявілі нядбайнасьць.

Ня лепш, а то і горш, у гэтым годзе пачалі працаваць у некаторых округах лікпункты, якія павінны ахапіць зусім няпісьменных рабочых. Дрэнна ў гэтых адносінах у Гомелі, Мазыры.

У гэтым годзе ўсе школы рабочай моладзі рэарганізаваны на базе сямігодкі. Камплектуюцца яны рабочымі з ведамі 4-ходкі, тады як у мінулым годзе прымаліся рабочыя малапісьменныя. Школы павышанага тыпу на базе васьмігодкі скасаваны.

Гэта рэарганізацыя надае ўсёй сыстэме рабочай асьветы большую суцэльнасьць і мэтазгоднасьць, унікаючы адзнак з прычын адсеву. У далейшым рэарганізацыя прадугледжвае адчыненьне 2-х клас. II-га канцэнтру з тым, каб пакідае магчымасьць адсеву.

Аднак, трэба агаварыцца, што новая праграма рабочых школ (яны маюць цяпер тры курсы, паколькі прымаюцца рабочыя з ведамі за 4-ходку) праведзена толькі на першых двух курсах—3-ці праходзіць яшчэ на старой праграме і пакідае магчымасьць адсеву.

Варта спыніцца і на прычынах апошняга, якія не залежаць ад агульнай сыстэмы рабочай асьветы.

На прадпрыемствах назіраецца часты перавод рабочых на зьмены. Раніцняя зьмена навучаецца ў вячэрніх школах. Пераведзеная ў вячэрнюю зьмену, яна мэханічна адсявецца ад вячэрніх школ.

Такія фармальныя адносіны з боку адміністрацыі прадпрыемстваў, пры ўсёй сваёй ненармальнасьці існавалі, існуюць дзе-ні-дзе і цяпер. Момант перакідкі рабочых на работу нават у іншыя гарады, сэзонная работа,—усё гэта павялічвае процант адсеву ад рабочых школ.

Зараз сыстэма асьветы прадугледзіла і гэтыя моманты. Адчынена новая рабочая школа з 4-х груп, якая мае на мэце абслугоўваць толькі пазьменных рабочых.

Перад НКА стаіць праблема пераводу ўсіх рабочых школ па пазьменныя групы. Але зараз вырашыць яе станоўча няма чыста грашовай магчымасьці. Усё-ж трэба сказаць, што за апошні год прароблена вялікая работа ў напрамку папярэджаньня адсеву і паглыбленьня рабочай асьветы. Гэту работу трэба ўзмацняць. Саюзныя арганізацыі павінны паклапаціцца аб тым, каб прадпрыемствы больш улічвалі інтарэсы рабочых пры пераводзе іх на зьмены.

Вячэрнія школы ня маюць будынкаў, ім прыходзіцца працаваць на трэцяй зьмене.

Час ужо адпаведным органам узьняць пытаньне аб пабудове цэнтральных дамоў рабочай асьветы.

П.

Студэнты завочнага рабфаку без кіраўніцтва

Менскі завочны рабфак даўно разаслаў другія заданьні, але студэнты ня ведаюць, як па гэтых заданьнях працаваць. Атрымалі кнігі і чытаюць іх без парадку, без мэтадычных указаньняў. Многія студэнты завочнага рабфаку знаходзяцца ў вёсках, не атрымліваюць ніякага кіраўніцтва. Студэнты з Пухавіцкага раёну нават ня ведаюць, ці пачаліся заняткі.

Лічу вельмі патрэбным склікаць канфэрэнцыю ўсіх студэнтаў рабфаку, на якой абгаварыць пытаньні заняткаў.

А. СКАВЫШ.

БОЛЬШ УВАГІ РАБОЧАМУ ТЭХНІКУМУ

(Менскі вячэрні рабочы тэхнікум)

З дакладу студкому на агульным сходзе аб рабоце тэхнікуму за мінулы год і са спрэчак высьветлілася, што НКА, ВСНГБ і саюзы будаўнікоў, дрэваапрацоўшчыкаў і мэталістых да навучальнага году амаль нічога ня ведалі пра гэту навучальную ўстанову, якая павінна рыхтаваць чырвоных спэцыялістых з рабочых, што працуюць зараз на вытворчасьці.

У летні пэрыяд гэтага году трэба было накіраваць на вытворчую практыку каля 20 студэнтаў старэйшых курсаў, але, дзякуючы «садзейнічаньню» ВСНГБ і некаторых саюзаў (дрэваапрацоўшчыкі), куды студэнцкія арганізацыі зьвярнуліся за дапамогай, гэта пытаньне прышлося вырашыць пры дапамозе ЦКК-РСІ.

Яшчэ і па сёньня адносіны да рабочага тэхнікуму працаўнікоў НКА зусім няўважлівыя. На сходах студэнтаў тэхнікуму, дзе заўсёды выяўляюцца хібы, ніколі ніхто з НКА ня бывае. Апошні факт: у памяшканьні тэхнікуму былі нам. наркома асьветы т. Слонім і ст. інспэктар індустрыяльных тэхнікумаў Сілін, якраз у часе апошняга сходу, але яны, ведаючы аб гэтым першым сходзе, не палічылі патрэбным паслухаць яго думак. Нават ня прышоў і дырэктар тэхнікуму т. Купрыянаў, які навінен быў зрабіць даклад аб выніках навучаньня мінулага году і плянах на гэты год.

Мы просім больш увагі і дапамогі нашаму тэхнікуму як ад НКА, таксама ад саюзаў і ВСНГБ.

СТУДЭНТЫ.

„Гордыеў" вузел асьветы

(ГОМЕЛЬ)

Яшчэ спачатку заняткаў у чыгуначных школах Заходніх чыгунак быў прапрацаваны пяцігадовы плян сацыялістычнага будаўніцтва, выяўлены перад настаўніцтвам задачы калектывізацыі і пастаўлен быў даклад аб інтэрнацыянальным выхаваньні ў школах. Але вось ужо два месяцы прайшло і, бадай, пра ўсё гэта забыліся. Сапраўды, што зроблена настаўніцтвам хоць-бы па дапамозе партыі ў калектывізацыі вёскі? Ці зрабіла хоць-бы сёе-тое настаўніцтва за гэты час па пытаньні калектывізацыі ў падшэфных вёсках? Ці вылучыла са свайго асяродзішча сілы для ліквідацыі няпісьменнасьці сярод калгасьнікаў? Дагэтуль у нас спрыяюць калектывізацыі толькі гутаркамі.

Настаўніцтва падыхтавалася да заняткаў па ліквідацыі няпісьменнасьці ў горадзе, але дагэтуль яшчэ няма з кім займацца.

У Гомелі асабліва адчуваецца нястача беларускіх кніг. У школах звычайна наглядацца такая зьява: ёсьць адзін экзэмпляр падручніка па літаратуры выпісаў Дзяржынскага і па ім прыходзіцца навучацца ўсім. VII-й групе таму проста немагчыма вывучаць беларускую літаратуру. Творы пісьменьнікаў можна даставаць толькі часткамі.

Беларускія газэты «Зьвязда» і інш. выпісваюцца 1-2 экзэмпляры. Сярод вучняў амаль не распаўсюджваецца газэты «Чырвоная Зьмена» і інш. У школах Гомельскага вузла пераважна навучаюцца дзеці чыгуначнікаў з лініі, зьвязаныя з вёскай. Між тым, газэты «Беларуская Вёска» ніхто ня чытае. Зусім ня выпісваюцца беларускія часопісі. Вузлавая газэта асьветнікаў у 1928-29 годзе выдавалася на расійскай мове. Школьныя пераважна таксама: рэдка траплялі ў іх артыкулы на беларускай мове. У гэтым годзе назіраецца тое-ж самае.

Свае справаздачы некаторыя школы пішуць на расійскай мове.

Вось як пакуль што справа з асьветай. На «зачараваным» Гомельскім чыгуначным вузле яшчэ шмат патрэбна намаганьняў, каб раскатурхацца самому асьветніку і зірнуць увочы пралетарскай грамадзкасьці, якая чакае выразнасьці ў працы на выкананьні чарговых задач па сацыялістычным будаўніцтве.

ЯНКА КАВАЛЁНАК.

Так далей немагчыма

(Менскі палітэхнікум)

У гэтым годзе прыём у Менскі палітэхнікум павялічыўся ў 3 разы. Студэнты жывуць у вельмі кепскіх умовах. 40 чалавек начуюць у майстэрні. Лекцыі рыхтаваць студэнтам зусім няма як. Заўважана адставаньне студэнтаў у вучобе, зрываецца сацспаборніцтва. Партыйная ячэйка ня ставіць на абгаварэньне такога становішча. Хутка чыстка, а падрыхтоўка да яе не разгорнута. Заняткі часта зрываюцца з-за недахвату выкладчыкаў.

Подпісы.

Белбюро саюзу чыгуначнікаў— аб шкодніцтве на Аршанскім вузле

Матар'ялы, зьмешчаныя ў „Зьвязьдзе", пацьвердзіліся

Прафарганізацыі вузла замазвалі палітычную сутнасьць падзей на транспарце

Прэзыдыум Белбюро ЦК саюзу чыгуначнікаў азнаёміўся з матар'ялямі расьсьледваньня шкодніцтва на Аршанскім вузьле.

Белбюро прызнала, што матар'ялы аб гэтым шкодніцтве, якія былі зьмешчаны ў «Зьвязьдзе», пацьвердзіліся.

Саюзная арганізацыя Аршанскага вузла імкнулася замазаць палітычную сутнасьць вылазкі клясавага ворага на транспарце. Да гэтага часу саюзныя работнікі Аршанскага вузла ня хочуць прызнацца ў сваіх памылках і займаюцца хвасьцізмам. Да гэтага часу няма рашучага пералому ў рабоце саюзных арганізацый.

Прэзыдыум Белбюро адзначае, што вылазкам клясавага ворага ча Аршанскім вузле спрыяла слабасьць культурна-выхаваўчай работы саюзных арганізацый, якія не рэагавалі на факты падрыву працдысцыпліны, рвацтва, нядбайнасьці і г. д. Вучпрафсожам трэба ў самы бліжэйшы час прыняць рашучыя меры да пераводу ўсёй саюзнай работы на новыя формы і мэтады, у самы бліжэйшы тэрмін праверыць сацыяльны склад членаў саюзу. Трэба прыняць рашучыя меры да ачышчэньня саюзных радоў ад кулацкага, антысавецкага і наогул чужога элемэнту, зьвярнуўшы сур'ёзную ўвагу на інтэрнацыянальнае выхаваньне рабочых.

Факты, якія мелі месца ў Ворпы, Віцібску і Гомелі, яшчэ раз пацьвярджаюць, што саюзныя арганізацыі ня мясцох не праводзяць у жыцьцё дырэктыў УсеЦСПС і беларускіх прафсаюзных арганізацый.

Прафсаюзныя арганізацыі павінны асвячасова рэагаваць на асобныя мосвячасова рэагаваць на асобныя мо- манты шкодніцтва, рвацтва, заняпаду працдысцыпліны, нядбайнасьці і заграстраць увагу рабочых мас на гэтых пытаньнях.

Прэзыдыум Белбюро ухваліў мерапрыемствы камісіі Аршанскага акругкому: зьняцьце з работы старшыні Вучпрафсожу т. Макарэвіча, а таксама вынясьненьне вымовы фракцыі прэзыдыуму Аршанскага Вучпрафсожу.

Прэзыдыум адзначае, што гаспадарчыя органы і праўленьне дарогі не зьвярнулі належнай увагі на выкрыцьцё фактаў шкодніцтва і не заўсёды ставілі пытаньне аб парушэньні дысцыпліны перад прафсаюзнымі арганізацыямі і шырокімі рабочымі масамі. Ня гледзячы на тое, што шкодніцтва зьяўлялася вынікам вылазкі клясавага ворага, гаспадарчыя органы да апошняга часу лічылі, што гэта звычайныя аварыі.

Прафарганізацыям прапанавана ў бліжэйшы час праверыць, як выконваюцца гаспадарчымі арганізацыямі пастановы вытворчых нарад, агульных сходаў рабочых, а таксама прапановы прафорганаў па дакладах гаспадарнікаў.

Вучкпрафсожам прапанавана ў тэрміновым парадку прапрацаваць пытаньне аб вылучэньні рабочых на тэхнічную работу і, асабліва, узяць курс на вылучэньне рабочых на службе пуці.

Рабочыя вылучэнцы--бяз увагі

ГАСПАДРАНІКІ І ПРАФСАЮЗЫ АДДАЮЦЬ МАЛА ЎВАГІ РАБОЧАМУ-ВЫЛУЧЭНЦУ

10-га лістапада ў ВСНГБ адбылася нарада рабочых-вылучэнцаў менскіх трэстаў і прадпрыемстваў. З дакладам аб становішчы і задачах вылучэньня рабочых на кіруючую гаспадарчую працу выступіў т. Грысэвіч, старшыня ВСНГБ.

— Да гэтага часу,—кажа тав. Грысэвіч,—гаспадарнікі ўсё яшчэ не зварачаюць належнай увагі на справу рабочага вылучэньня. Мала высунута на кіруючую працу камсамольцаў і жанчын. Гаспадарнікі ня цікавяцца пытаньнямі павышэньня агульнага і тэхнічнага ўзроўню вылучаных таварышоў.

Даклад т. Грысэвіча выклікаў гарачыя спрэчкі, у якіх прымалі ўдзел рабочыя-вылучэнцы трэстаў і прадпрыемстваў.

Тав. Дзіканаў (галяштарэйная ф-ка) адзначае, што некаторыя вылучэнцы баяцца, што яны не справяцца з работай, у некаторых з іх ёсьць нявер'е ў сваё сілы.

Тав. Пашкевіч—вылучэнец у трэсьце Белдзяржбуд—адзначае, што ніякага кіраўніцтва вылучэнцамі няма. Адсутнічае падрыхтоўка кадраў вылучэнцаў.

З боку ВСНГБ, ЦСПСБ і іншых прафарганізацый,—кажа тав. Мамонаў (завод «Беларусь»),—нічога ня робіцца, каб дапамагчы вылучэнцам пашырць свае тэхнічныя веды.

Усе выступаўшыя рабочыя-вылучэнцы адзначалі, што прафэсыянальная арганізацыі зусім ня цікавяцца вылучэнствам рабочых. Вылучаныя таварышы трапяць усялякую сувязь з прафсаюзамі, якія не зьвяртаюць ніякай увагі на тое, як працуюць і жывуць іх вылучэнцы.

Нарадай прынята рэзалюцыя, у якой адзначаецца неабходнасьць больш цеснай сувязі паміж гаспадарнікамі, прафсаюзамі і рабочымі-вылучэнцамі.

Шырэй разгорнем матар'яльную і маральную дапамогу палітзьняволеным

Пасьпяхова правядзем кампанію зімовай дапамогі

Кампанія зімовай дапамогі

З году ў год МОПР'ам праводзіцца кампанія зімовай дапамогі палітзьняволеным буржуазных турмаў. Такая спэцыяльная кампанія праводзіцца кожны год з пачатку восені і выклікаецца тым, што звычайна ў гэты час агульнае становішча палітзьняволеных буржуазных вастрогаў значна пагоршваецца. Да агульнага недаяданьня і настаянных катаваньняў дадаецца зіма, якая нясе палітзьняволеным холад і вільгаць. Цёплага абутку і цёплай вопраткі, вядома, няма. Апрача МОПР'у няма каму паклапаціцца аб дапамозе нашым таварышом, якім прыходзіцца пакутаваць доўгія зімовыя месяцы ў сырых і халодных турэмных сутарэньнях.

Сёлета кампанія зімовай дапамогі набывае асабліва важнае значэньне ў сувязі з тым, што мы маем новыя і новыя ахвяры фашызму і ў Польшчы, і ў Нямеччыне, і ў Румыніі, і ў іншых краінах, дзе пануе капітал і «дэмакратыя». Рабочыя і працоўныя масы капіталістычных краін дорага заплацілі за сваю «дэрзость» у дні 12-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі выйсьці на вуліцу. Рабочым яшчэ раз даказалі, што права на вуліцу яны ня маюць. Вуліцы Гамбургу, Варшавы, Бухарэсту зноў заліты крывёю рэвалюцыйных рабочых і сялян. Масавыя арышты зноў пракаціліся па буйных рабочых цэнтрах капіталістычнай Эўропы і Амэрыкі. Рабочыя масы яшчэ і яшчэ раз выказалі сваю няўхільную волю да барацьбы за абарону СССР, за зьнішчэньне капіталізму. Пралетарыят і падняволныя народы ў барацьбе сваёй за ўсеагульнае вызваленьне становяцца ўсё сьмялей і актыўней. Вулічныя бойкі ў дні Кастрычніцкага сьвята зноў аб гэтым сьведчаць. Новыя сьвежыя ахвяры фашызму заклікаюць нас ўсіх да актыўнай дапамогі замежным барацьбітом рэвалюцыі — лепшым сыном рабочае клясы і рэвалюцыйнаму сялянству. На баку паміраючага капіталізму знаходзяцца сусьветны фашызм і міжнародная сацыял - дэмакратыя, якая арганічна зраслася з буржуазіяй і фашызмам; на баку змаганьнікаў за сваю свабоду рабочых і сялян былі і будзем мы — рабочыя, працоўнае сялянства і ўсе працоўныя масы гораду і вёскі нашае савецкае краіны. Усё, што ёсьць здаровага, рэвалюцыйнага ў нашай БССР, павінна неадкладна выступіць на дапамогу па лепшым правядзеньні кампаніі зімовай дапамогі. Пачуцьцё пралетарскай салідарнасьці да нашых зарубежных братоў зноў павінна загаварыць. Гэта пачуцьцё, якое глыбока жыве ў сэрцах рабочых і працоўных мас нашай Савецкай Беларусі, не адзін раз сябе выявіла. Даволі прыпомніць кампаніі зімовай дапамогі мінулага году, якія далі нам 81 тыс. рублёў, кампанію дапамогі ахвярам сацыял-фашызму ў дні 1 мая, якая дала звыш 60 тыс. руб. Спадзяемся, што і сёлетняя кампанія зімовай дапамогі пры актыўным падтрыманьні рабочых і працоўных мас будзе праведзена з найвялікшым посьпехам, так, як гэтага патрабуюць інтарэсы міжнароднай клясавай барацьбы.

М. КАЛМЫК.

МОПР сярод дзяцей

З мэтай палепшаньня працы па інтэрнацыянальным выхаваньні дзяцей і шырокага растлумачэньня сутнасьці клясавай барацьбы і карэньняў фашызму, шляхам масавага ўцягненьня дзяцей у рады МОПР'у, Менакругком МОПР'у сумесна з акруговым бюро піянэраў у хуткім часе склікае шырокую агульна-гарадзкую канфэрэнцыю піянэраў і вучняў.

У сувязі з гэтым мерапрыемствам, неабходна, каб зараз-жа была створана грамадзкая думка ў друку, камсамольскіх ячэйках, ва ўсіх піянэрэтрадах, фарпостах і ў школах.

Неабходна, каб зараз-жа ва ўсіх піянэратрадах і школах з боку важатых атрадаў і настаўнікаў пачалася падрыхтоўка да канфэрэнцыі піянэраў і вучняў г. Менску шляхам правядзеньня гутарак з піянэрамі і вучнямі на тэму: «МОПР і інтэрнацыянальнае выхаваньне дзяцей», і выбараў дэлегатаў.

На канфэрэнцыю будуць абраны каля 600 дэлегатаў па модусе: 1 дэлегат ад 10 піянэраў і вучняў. Канфэрэнцыя мае быць 2 дні.

Ц—н.

Хроніка МОПР'у

Па г. Менску сабрана каля 1.000 мяшкоў для загатоўкі бульбы, што дало 230 руб. на карысьць палітзьняволеным. Мяшкі яшчэ паступаюць. У гэтай кампаніі асабліва вывяліла сябе ячэйка МОПР'у Меншвэю, якая сабрала каля 300 мяшкоў і рагож.

У канцы сьнежня месяца ЦК МОПР'у БССР склікае ўсебеларускую нараду сакратароў ячэек МОПР'у, калгасаў і саўгасаў па пытаньні арганізацыі ячэек МОПР'у ва ўсіх калгасах і саўгасах і вярбоўкі калгасьнікаў і рабочых саўгасаў у МОПР.

На карысьць палітзьняволеным і іх сем'ям ячэйка МОПР'у ЦРА арганізуе 18 лістапада вялікі сімфанічны канцэрт у Бэлдзяржтэатры. Увесь збор пойдзе у фонд зімовай кампаніі дапамогі.

У сьнежні месяцы Менакругком МОПР'у праводзіць агульна-гарадзкую канфэрэнцыю чытачоў і падпісчыкаў час. «Путь МОПР'а» па пытаньні паўлічэньня ліку падпісчыкаў і выяўленьня думкі чытачоў аб зьместе часопісу.

Забесьпячэньне батрацтва і пастухоў на зімовы пэрыяд

1600 батракоў і пастухоў атрымаюць дапамогу па беспрацоўі

Прэзыдыум ЦСПСБ намецію рад мерапрыемстваў па забесьпячэньні батрацтва і пастухоў Беларусі на зімовы пэрыяд.

Ня менш 1600 батракоў атрымаюць дапамогу па беспрацоўі. Ня менш 600 батракоў і пастухоў, якія маюць права на атрыманьне дапамогі па беспрацоўі, будуць арганізаваны ў арцелі па лесараспрацоўках.

На працягу зімовага пэрыяду павінна быць прапушчана праз рэспубліканскі санаторы ня менш 20 батракоў і пастухоў. 100 батракоў будуць пасланы ў дамы адпачынку. 10 месц браніруюцца для іх на курортах агульна-саюзнага значэньня.

Арганізацыя ВТНУ ў Гомелі

11-га лістапада пры ЦСПСБ адбылася культнарада, якая заслухала даклад нам. Наркамасьветы т. Слоніма аб праекце арганізацыі ў БССР вышэйшай тэхнічнай навучальнай установы. Апошняя будзе складацца з 5-ці факультэтаў — будаўнічага, мэханічнага, хэміка-тэхнічнага і інжынэрна-эканамічнага. Нарада выказалася за адкрыцьцё гэтай навучальнай установы ў Гомелі ў 1930-31 навучальным годзе. Новая навучальная ўстанова будзе рыхтаваць інжынэраў вузкай спэцыяльнасьці.

Дадатковая падпіска на пазыку яшчэ не распачыналася

ВОРША. (Наш кар.). Дадатковая падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі сярод рабочых Аршанчыны яшчэ не распачыналася. На мясцох арганізацыі чакаюць указаньняў зьверху, не праяўляючы сваёй уласнай ініцыятывы.

Падпіска сярод сялянства акругі на 3-ю пазыку індустрыялізацыі праходзіць нездавальняюча. Да гэтага часу заданьне выканана толькі на 69 проц. Асабліва адстаюць раёны: Чарэйскі, выканаўшы заданьне толькі на 34 проц., Лядзянскі—43,5 проц., Талачынскі—58,9 проц. і Дубровенскі, які выканаў заданьне толькі на 19 проц.

Раённыя і сельскія камісіі садзейнічаньня не працуюць, Асабліва слаба пастаўлена гэта работа ў Дубровенскім раёне, які ў эканамічных адносінах зьяўляецца досыць моцным.

Зараз акруга атрымала дадатковае заданьне распаўсюдзіць сярод сялянства пазыкі на 39.300 руб. Каб гэтае заданьне было выканана поўнасьцю і ў тэрмін, трэба нізавым арганізацыям выявіць больш сваёй уласнай ініцыятывы па дадатковай падпісцы на 3-ю пазыку.

Сярод сялян рэалізавана толькі 46 проц. заданьня

ГОМЕЛЬ, (Наш кар.). Падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі сярод сялянства па Гомельшчыне ідзе надзвычайна марудна. На 10-е лістапада распаўсюджана аблігацый пазыкі на 84.515 руб., што складае 46 проц. заданьня.

Асноўная прычына такога павольнага разьмяшчэньня пазыкі—слабая растлумачальная работа на вёсцы аб значэньні пазыкі. Ёсьць вёскі, дзе сяляне нават ня ведаюць, нават ня чулі аб выпуску 3-й пазыкі.

Накіраваныя ў вёскі работнікі, для правядзеньня растлумачальнай працы аб пазыцы, абмежаваліся толькі дакладамі на сходах, а ўсю практычную работу ўскладалі на вясковыя камісіі садзейнічаньня, якія таксама бязьдзейнічалі і нічога канкрэтнага ня робяць па папулярызацыі пазыкі на вёсцы. Паасобныя васковыя камісіі яшчэ да апошняга часу не рэалізавалі ніводнай аблігацыі пазыкі.

Крэдытныя т-вы таксама праяўляюць нядбайнасьць у гэтай справе. Большасьць крэдытных т-ваў не рэалізавала ніводнай аблігацыі і нічога не зрабіла для абмену аблігацый пазыкі узмацненьня сялянскай гаспадаркі на 3-ю пазыку.

Апошняе месца па разьмеркаваньні пазыкі займае Хойніцкі, Брагінскі, Церахоўскі і Веткаўскі раёны. Добра праходзіць падпіска ў Камарынскім раёне, які выканаў сваё заданьне на 101 проц.

У прэзыдыуме АВК

ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ НОВАГА ЗЯМЕЛЬНАГА КОДЭКСУ ПАДРЫХТОЎКА ДА ПЕРАВЫБАРАЎ САВЕТАЎ ПА МЕНСКАЙ АКРУЗЕ

Прэзыдыум АВК прызнаў неабходным правесьці шырокае абгаварэньне працоўнымі масамі новага зямельнага кодэксу. Старшыні акрэа т. Каранеўскаму прапанавана тэрмінова скласьці плян абгаварэньня праекту кодэксу.

ПЕРАВЫБАРЫ КАМІТЭТАЎ СЯЛЯНСКАЙ УЗАЕМАДАПАМОГІ

Створана Менская акруговая камісія па перавыбарах камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі. У камісію ўваходзяць прадстаўнікі АК КП(б)Б, АК ЛКСМВ, АК КСТУ, саюзу працаўнікоў зямлі і лесу і інш. Старшынёй камісіі вызначаны т. Кушнэр.

Арганізавана акруговая камісія па правядзеньні перавыбараў саветаў у 1930 годзе. Старшынёю камісіі вылучаны старшыня АВК тав. Аксючыц. Усім раённым, гарадзкім і сельскім саветам прапанавана стварыць новыя выбарчыя камісіі не пазьней 1-га сьнежня. Выбарчыя камісіі павінны быць поўнасьцю забясьпечаны прадстаўніцтвам адпаведных устаноў, арганізацый, жанчын і нацменшасьцяй

Ліст у рэдакцыю

Паважаны тав. рэдактар!

У газэце «Зьвязда» ад 5-га лістапада (№ 254) зьмешчана заметка «Чыстка асьпірантуры ад ідэалёгічна-чужога элемэнту», першая частка гэтай заметкі, якая датычыць БДУ, не адпавядае сапраўднасьці, з прычыны чаго праўленьне унівэрсытэту паведамляе, што асьпірант т. Ашаровіч аслабанёны ад асьпірантуры ў БДУ ня як ідэалёгічна-чужы элемэнт, а як таварыш, які займае адказную кіруючую партыйную пасаду і ня можа з прычыны гэтага праходзіць асьпірантуры. Што датычыць тав. Забелы, то ён аслабанёны ад асьпірантуры ў БДУ, як прайшоўшы асьпіранцкі стаж і накіраваны ў распараджэньне Галоўнавукі БССР.

З камуністычным прывітаньнем

нам. рэктара БДУ РЫЎЛІН.

Сутычка трамваю з фургонам

Учора ў 11 гадз. дня на рагу Савецкай і Камсамольскай вуліц трамвайны вагон № 2, які ходзіць па лініі Таварная-Камароўка, наскочыў на цэрабкопаўскі фургон з булкамі і хлебам. Вагон ішоў пад кіраўніцтвам вагонаважатага Сыеўскага. Фургон з булкамі быў перакулены, возчык моцна ушыб нагу. Пярэдняя частка вагону папсавана, у ім таксама выбіты вокны. Прычыны катастрофы высьвятляюцца.

РАДЫЁ-ПЕРАДАЧА. 18-га лістапада ў 5 з пал. гадз. станцыя «Камінтэрн» перадае з Курску інструктаж акругі. Будуць выступаць: старшыня Курскага АВК, сакратар акругкому УсеКП(б), прафэсіянальныя і грамадзкія работнікі. Просьба да ўсіх АВК, РВК, партыйных камітэтаў і грамадзкіх работнікаў БССР слухаць інструктаж на сваіх радыёапаратах.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Пачаўся прыём у Ленінградзкі кампалітасьветны інстытут імя Крупскай. Таварышы, якія жадаюць паступіць у гэты інстытут, павінны атрымаць анкеты ў АПА акругкому (3-ці паверх, пакой 19).

Кіравацца трэба правіламі прыёму, надрукаванымі ў «Правде» ад 18 кастрычніка 1929 г. за № 241/4375.

Пашыраны пленум праўленьня шэф-ва Кастрычніцкага р-ну адбудзецца ў панядзелак, 18 лістапада, а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні райкому. Парадак дня наступны: замацаваньне пляну працы на зімовы пэрыяд, аб ажыўленьні працы ўсіх аддзяленьняў і бягучыя справы.

БДУ. У нядзелю, 17-га лістапада, а 3-й гадз. дня ў аўдыторыі № 41 адбудзецца пасяджэньне асьпіранцкага сэмінару.

Заняткі слухачоў курсаў вылучэнцаў акруговых устаноў пачнуцца 17-га лістапада, а 6-й гадз. увечары ў 22-й школе (Падгорны зав. № 8).

Нарада сакратароў ячэек КП(б)Б, старшынь фабзаўмясцкомаў (партыйцаў), кіраўнікоў савецкіх, каапэрацыйных і іншых устаноў (партыйцаў) па пытаньні правядзеньня кампаніі па заключэньні калдагавароў саюзу саўгаспрацаўнікаў адбудзецца ў залі пасяджэньняў АК КП(б)Б 17-га лістапада, а 7-й гадз. увечары.

Дом Камасьветы. Сёньня а 7½ гадз. увечары ў Доме Камасьветы адбудзецца вечар партыйнага, камсамольскага і беспартыйнага рабочага актыву. Тав. Стракоўскі зробіць даклад на тэму: «Пяцігадовы плян індустрыялізацыі БССР і задачы сацыялістычнага спаборніцтва». Пасьля дакладу—мастацкая частка.

Уваход па білетах, разданых па парт'ячэйках і ў Доме Камасьветы.

Дом Асьветы. 17-га лістапада, а 7-й гадз. увечары арганізацыйны сход усіх таварышоў, якія запісаліся і жадаюць запісацца ў вайсковы гурток.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

У панядзелак, 18-га лістапада, а 7-й гадзіне ўвечары, у Доме Працы, 2-гі паверх, пакой № 10, склікаецца

агульна-гарадзкі сход ІТР,

на якім т. т. Каплан і Алейнікаў зробяць даклад аб Пленуме УсеМБІТ і мэтадах далейшай працы сэкцыйных арганізацый.

Запрашаюцца члены бюро ІТС і ўсе ІТР г. Менску.

На 24-е лістапада а 10 гадзіне Праўленьне Белкахотсаюзу склікае агульныя сходы папяўнічых Капыльскага, Сьмілавіцкага і Чэрвенскага раённых калектываў:

Парадак дня:

1. Справаздача райбюро і рэвкамісіі. 2. Выбары райбюро і рэвкамісіі. 3. Загатоўка пушкіны. 4. Двухдзёньнік абароны краіны. 5. Бягучыя справы.

Скліканьне сходаў ускладаецца па Капыльскім калектыве на тав. Бараноўскага, па Сьмілавіцкім на тав. Мачулана і па Чэрвенскім на тав. Семашка.

Яўка на сходы членаў саюзу абавязкова.

Праўленьне Белкахотсаюзу.

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР
Ц. Дауганьскі.
НЯДЗЕЛЯ, 17-га лістапада для саюзу мэталістых. Білеты ў саюзе.
Паядынак машын.
Пачатак спэктаклю роўна а 8 з пал. гадз. увеч.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
Буйны мастацкі фільм па славутым рамане Ф. ГЛАДКОВА
ЦЭМЭНТ
Звыш праграмы Першы год пяцігодкі
Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса—ад 5 г.

КІНО Інтэрнацыянал
Амэрыканскі фільм
НЕБАСКРОБ
драма ў 6 частках
Звыш праграмы хроніка „Совкино" № 60

КІНО Пралетарый
Новы фільм вытворч. „Совкино" з жыцьця вандроўных цыркачоў
АПОШНІ АТРАКЦЫЁН
драма ў 6 частках.
Звыш праграмы кіно-хроніка „Совкино" № 62
Пачатак—а 7 г. увеч. Каса—ад 5 з пал. г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"
Выдатны фільм
ВАСЯ РЭФАРМАТАР
у 6 частках.
Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня. Па нядзелях і сэрадах ад 12 гадз. дня.
Цана білета 10 кап.

КІНО
Сусьветны баявік
ДРУГОЕ ЖЫЦЬЦЁ

ПАТРЭБНЫ
вопытныя і спрактыкаваныя АГЭНТЫ
параспаўсюджваньні часопісі „Узвышша" па Менску і на мясцох.
УМОВЫ АПЛАТЫ: сталая пэнсія (120 р.) або процанты.
Зьвяртацца вусна ці пісьмова ў рэдакцыю „Узвышша"—(Савецкая, 68, Дом Пісьменьніка)

ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛЬТЭРЫІ
Курсы рыхтуюць работнікаў для нізавых каапэрацыйных арганізацый, крэдытных таварыстваў, арцеляй усіх відаў, калгасаў, саўгасаў і г. д.
Тэрмін навучаньня 8 месяцаў.
Прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 4 груп сямігодкі. Прыём адбываецца круглы год.
Скончыўшыя курсы атрымліваюць адпаведнае пасьведчаньне.
Плата за вуро 33 руб. уносіцца так: 9 руб. пры паступленьні, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8-месяц і па 4 руб. штомесячна ў па чатку кожнага навучальнага месяцу. Умовы прыёму высылаюцца за 2 дзесяцікапеечныя марні.
Грошы пераводзяцца па адрасе: Менск, Усекабанк, бяг. рахунак № 682. Усю карэспандэнцыю накіроўваць: Менск Усекабанк, Завочным курсам.

ЗАВОЧНЫ ПЭДФАК
Працягваецца прыём заяў на літаратурна-лінгвістычнае, сацыяльна-гістарычнае і педалёгопэдагагічнае аддзяленьні Завочнага Пэдфаку пры Пэдфаку БДУ.
ЗАЯВЫ ПРЫМАЮЦЦА ў Дэканаце Пэдфаку (Менск, Земляробскі зав. № 4).
Пры заявах павінны прыкладацца, дакуманты аб асьвеце, месцы працы, пэдагагічным стажы і анкета, заверная адпаведнай савецкай, або прафэсыйнай установай.
БЮРО ЗАВОЧНАГА ПЭДФАКУ.

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ
EXTRACTUM TESTICULORUM
ПРЕЙСКУРАНТ ВЫСЫЛАЕТСЯ БЕСПЛАТНО
ЦЕНА Ф